Давядзем на справе наша ўменьне рашуча перабудавацца на аснове гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б)

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 5 КАП.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ФЭДЭРАЦЫІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ І ГАЛОУМАСТАЦТВА БССР

№ 9 1932 Менск 25 мая

За соцыялістычную літаратуру, за магнітабуды ў літаратуры

Папярэдні і сёнешні нумары нашай газэты прысьвечаны выяўленьню грамадзкай думкі савецкіх пісьменьніцкіх мас і працаўнікоў мастацтва БССР у сувязі з гістарычнай пастановай ЦК УсеКП(б) пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый.

Пераважная маса савецкіх пісьменьнікаў, што сапраўды імкнуцца сваёй мастацкай творчасьцю актыўна ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве, здолелі адпаведным чынам ацаніць гэтую пастанову. Выступленьні лепшых савецкіх пісьменьнікаў і працаўнікоў мастацтва БССР выразна сьведчаць пра тое, што пастанова ЦК паслужыла магутным вагаром новага ўздыму энэргіі і энтузіязму гэтых кадраў.

Маса савецкіх пісьменьнікаў і працаўнікоў мастацтва з пастановы ЦК УсеКП(б) зрабіла правільны вынік, што гэты дакумант, які кажа пра організацыйныя мерапрыемствы, ня ёсьць дакумант «чыста-організацыйнага парадку. Усякія організацыйныя мерапрыемствы партыі, зьмены мэтадаў і форм работы ёсьць перш за ўсё вынік узрослых новых задач агульна-палітычнага, экономічнага і ідэолёгічнага характару, у адпаведнасьці з сутнасьцю задач эпохі пабудовы соцыялізму. Існуючыя да гэтага часу формы організацыі савецкіх пісьменьнікаў і працаўнікоў мастацтва (РАПП, ВОАПП ды інш.) на дадзеным этапе тармозяць разьвіцьцё літаратуры і мастацтва ў Савецкім Саюзе. На падставе гэтага ЦК УсеКП(б) вынес зусім выразную пастанову «ліквідаваць асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў». І толькі няўменьнем перабудавацца на-хаду, няўменьнем зрабіць паварот можна тлумачыць асобныя моманты хныканьня і няправільнага тлумачэньня пастановы ЦК УсеКП(б), якія назіраюцца ў паасобных пісьменьнікаў. Зусім правільна «Праўда» у рэдакцыйным артыкуле «На ўзровень новых задач» паказвае на тое, што

«партыя неадразова давала кіраўніцтву РАПП паказаньне пра неабходнасьць рашучай перабудовы сваёй работы, набліжэньне яе да задач соцыялістычнага будаўніцтва. Шмат разоў паказвалася на тое, што РАПП—не адміністрацыйная, а ідэёва-выхаваўчая організацыя. Паказвалася на неабходнасьць разгортваньня самакрытыкі, на неабходнасьць з'яднаньня ўсіх сіл пролетарскай літаратуры і крытыкі на прынцыповых позіцыях. Аднак, усе гэтыя простыя непасрэдныя паказаньні партыі ў значнай ступені ня былі выкананы.

Вось чаму так сваечасова пастанова ЦК пра ліквідацыю РАПП і ВОАПП пра аб'яднаньне ўсіх пісьменьнікаў, што падтрымліваюць пляцформу савецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве, у адзіны саюз савецкіх пісьменьнікаў з комуністычнай фракцыяй у ім. Пастанова ЦК дасьць рашучы штуршок ліквідацыі групавой адасобленасьці, гуртковай замкнутасьці, элемэнтам сямейнасьці і необ'ектыўнасьці крытыкі. Пісьменьнікі, што спачуваюць соцыялістычнаму будаўніцтву, сумесна з пролетарскімі пісьменьнікамі ўвойдуць у адзіны саюз савецкіх пісьменьнікаў. Ствараюцца ўмовы для ўзьняцьця мастацкай літаратуры на больш высокую ступень, для сапраўды прынцыповай разгорнутай барацьбы з антыпролетарскімі, опортуністычнымі тэндэнцыямі і плынямі ў мастацкай літаратуры і мастацтве».

Неабходна на аснове пастановы ЦК і паказаньняў ЦО партыі «Праўды» зжыць адмоўныя моманты ў рабоце з савецкімі пісьменьніцкімі кадрамі і рушыць наперад да ажыцьцяўленьня задач па стварэньню сапраўднай соцыялістычнай літаратуры».

«Лёзунг—за соцыялістычную літаратуру, за магнітабуды ў літаратуры—павінен стаць штандарам саюзу пісьменьнікаў. Пролетарыят пад кіраўніцтвам компартыі будуе соцыялізм, стварае соцыялістычную культуру. Літаратура ёсьць частка агульнага фронту культурнага будаўніцтва. Пролетарская літаратура, што правільна адлюстроўвае соцыялістычныя адносіны, якія склаліся і складаюцца, бясспрэчна па сваёй сутнасьці зьяўляецца соцыялістычнай. Аднак няправільна поўнае атаесамленьне пролетарскай літаратуры пераходнага пэрыоду, соцыялістычнай па сваёй сутнасьці, з літаратурай соцыялістычнага грамадзтва» («Праўда»).

Нашы задачы ў галіне літаратуры вызначаюцца генэральнай лініяй партыі, паказаньнямі Леніна, паказаньні правадыра партыі т. Сталіна. Пра задачы літаратуры Ленін пісаў у сваім артыкуле «Партыйная організацыя і партыйная літаратура» наступнае:

«Гэта будзе вольная літаратура, таму што не карысьць і не кар'ера, а ідэя соцыялізму і спачуваньня працоўным будуць вербаваць новыя і новыя сілы ў яе шэрагі. Гэта будзе вольная літаратура, таму што яна будзе служыць не перасычанай героіне, не «верхнім дзесяці тысячам», што нудзеюць і пакутуюць ад ажырэньня, а мільёнам і дзесяткам мільёнаў працоўных, якія складаюць цьвет краіны, яе сілу, яе будучыню. Гэта будзе вольная літаратура, што апладняе апошнія словы рэволюцыйнай мысьлі чалавецтва вопытам і жывой работай соцыялістычнага пролетарыяту, што стварае пастаянную ўзаемадзейнасьць паміж практыкай мінулага (навуковы соцыялізм, які завяршыў разьвіцьцё соцыялізму ад яго прымітыўных і ўтопічных форм) і практыкай сёнешняга (сёнешняя барацьба таварышоў рабочых)».

У гэтых словах геніяльнага кіраўніка рэволюцыйнай рабочай клясы вычарпана ўся сутнасьць нашых задач як у галіне непарыўнай сувязі з рэволюцыйнай практыкай рабочае клясы, якая будуе соцыялізм і змагаецца за ажыцьцяўленьне Кастрычнікавай рэволюцыі ва ўсім сьвеце, так і ў галіне штодзеннай вучобы, у галіне бальшавіцкай партыйнасьці ў літаратуры, служэньня кожным словам, дзеяньнем, кожным сваім выступленьнем задачам пролетарскай рэволюцыі.

Узбраеньне марксыцка-ленінскім сьветапоглядам ёсьць асноўны сродак барацьбы з клясава-варожымі элемэнтамі, асноўны сродак перамаганьня буржуазных і дробнабуржуазных тэорый, элемэнтаў меншавіствуючага ідэалізму, элемэнтаў контррэволюцыйнага троцкізму ў літаратуры і мастацтве. Трэба павесьці рашучую барацьбу супроць меўшых месца памылковых, правых і «левых» установак, супраць элемэнтаў пераверзеўшчыны, літфронтоўшчыны, дэборыншчыны, якія мелі месца ў установах і выказваньнях паасобных працаўнікоў былога кіраўніцтва РАПП і ВОАПП. Трэба рашуча зжыць меўшыя месца грубыя памылкі ў адносінах да спадарожнікаў, лявацкую ўстаноўку «не спадарожнік, а саюзьнік ці вораг». Барацьба за спадарожніка, які будзе ў адзіным саюзе савецкіх пісьменьнікаў, сумесна з пролетарскімі пісьменьнікамі працаваць на карысьць соцыялізму, працягваецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы як у галіне экономікі, так і ў галіне ідэолёгіі. Спадарожнік у масе ідзе да нас, але зусім недапушчальна пакладацца на самацёк—такі самацёк зьяўляецца хужэйшым відам опортунізму ў галіне літаратуры і мастацтва. Зжываючы необ'ектыўную крытыку, дзёрганьне, адміністраваньне і групаўшчыну, неабходна разгарнуць вялікую работу са спадарожнікамі, з тым, каб дапамагчы яму ўключыцца ў барацьбу за соцыялізм.

«Перад саюзам, асабліва перад яго комуністычнай ачсткаю, стаіць задача весьці правільную лінію ў адносінах спадарожнікаў, усямерна прыцягваючы іх на бок пролетарыяту, уцягваючы іх у актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве, дапамагаючы ім аваладваць марксыцка-ленінскай мэтодолёгіяй, адначасова даючы рашучы адпор клясавым ворагам у галіне літаратуры» («Праўда»).

Рабочая кляса і працоўныя масы, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, на чале з тав. Сталіным, у гэтым годзе завяршаюць першую пяцігодку ў чатыры гады і стаяць на парозе другой пяцігодкі, якая будзе пяцігодкай ліквідацыі клясы ў краіне, пяцігодкай ліквідацыі рэшты капіталізму ў экономіцы і сьвядомасьці людзей. Пабудова бясклясавага грамадзтва ажыцьцяўляецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, асабліва на паасобных вучастках і ў паасобных раёнах. Задача літаратуры і мастацтва складаюцца з таго, каб паводле мысьлі Леніна, апладніць апошнія словы рэволюцыйнай мысьлі чалавецтва вопытам і жывой работай соцыялістычнага пролетарыяту. Гэтая задача вялізарнай важнасьці можа быць ажыцьцявіма толькі пры тых умовах, калі наша літаратура і мастацтва сапраўды зоймуцца паказам героя пяцігодкі, сапраўды будзе працаваць над гісторыяй фабрык і заводаў, над паказам нашых перамог у галіне колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, над паказам кіруючай ролі нашай партыі і Комінтэрну ў пролетарскай рэволюцыі, над паказам героічнай Чырвонай арміі, над проблемамі абароны нашай краіны і ператварэньня будучай імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую.

Новы этап патрабуе хуткай перабудовы, перабудовы ў такт з эпохай. Партыя вызначыла шляхі гэтай перабудовы. Сакавіковы аб'яднаны плэнум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначыў адставаньне літаратуры БССР ад задач соцыялістычнага будаўніцтва і вызначыў шляхі далейшага прасоўваньня наперад у гэтай галіне. Мы стаім напярэдадні організацыі саюзу савецкіх пісьменьнікаў у БССР. Неабходна па-бальшавіцку ажыцьцявіць дырэктывы партыі, бо толькі такім шляхам мы сапраўды давядзем, што ўмеем практычна, на справе ажыцьцяўляць лінію партыі ў галіне літаратуры і мастацтва.

Сход пісьменьнікаў у Харкаве

Гэтымі днямі адбыўся сход пісьменьнікаў у Харкаве. На сходзе прысутнічалі ўсе пісьменьнікі, працаўнікі мастацтва і выдавецтваў. З дакладам пра рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка выступіў тав. Ів. МІКІТЭНКА.

Прынята рэзолюцыя, у якой сход вітае пастанову ЦК і абяцае прыкласьці ўсе сілы да перабудовы пісьменьніцкага фронту і заклікае пісьменьнікаў Савецкай Украіны ўзяцца за работу па стварэньню Магнітабудаў літаратуры.

Організацыя саюзу савецкіх пісьменьнікаў Арменіі

ЭРЫВАНЬ, 14-га мая (ТАСС). Згодна пастановы ЦК УсеКП(б) пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый пастановай ЦК КП(б)А ліквідуюцца: асоцыяцыя пролетарскіх пісьменьнікаў, фэдэрацыя пісьменьнікаў Арменіі і саюзы пролетарскіх музыкантаў, мастакоў і архітэктараў. Організуецца саюз савецкіх пісьменьнікаў Арменіі. Для організацыі саюзу створана комісія. Створаны комісіі і па іншых галінах мастацтва.

Пастанова праўленьня РАПП

Праўленьне Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў (РАПП) абвяшчае Асоцыяцыю ліквідаванай і пастанаўляе перадаць організацыйнаму комітэту свае часопісі, фінансы і маёмасьць.

Літаратурныя гурткі на прадпрыемствах працягваюць сваю работу.

САКРАТАРЫЯТ РАПП: Л. Авэрбах, І. Макар'еў, А. Фадзееў, У. Кіршон, Ф. Панфёраў.



Піонэрорганізацыі ў дзень дзесяцігодзьдзя прывітаньне ад савецкіх пісьменьнікаў БССР

Ал. Дудар

Вызваліцца ад грузу мінулага

Пастанову ЦК УсеКП(б), на мой погляд, трэба разглядаць як мобілізацыю творчых сіл савецкай літаратуры на змаганьне за стварэньне літаратуры соцыялістычнай. Калі краіна становіцца на парог соцыялізму, перад усёй літаратурай і перад кожным савецкім пісьменьнікам паўстаюць неадкладнейшыя і сур'ёзьнейшыя патрабаваньні.

Перад тымі беларускімі пісьменьнікамі да якіх належу я, якія ў сваім мінулым маюць цяжкі багаж актыўнэга супрацоўніцтва з клясавым ворагам, ва ўсю вялічыню паўстае задача—шчыльнейшага ўключэньня ў соцыялістычнае будаўніцтва, у барацьбу за стварэньне соцыялістычнай культуры, нацыянальнай па форме і інтэрнацыянальнай па зьмесьце. Іншых шляхаў няма і ня можа быць, бо пастанова ЦК не адмяняе клясавай барацьбы ў літаратуры, не закасоўвае перамог і дасягненьняў пролетарскае літаратуры, але, зьнішчаючы ўсякія організацыйныя бар'еры, дае магчымасьць набліжэньня да пролетарскай літаратуры ўсім, хто да гэтага імкнецца і даводзіць: гэта ня словамі дабрамыслымі дэклярацыямі, а фактамі конкрэтнай творчасьці.

Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў, у тым ліку і БелАПП, створаныя ў часы найбольш вострых клясавых боек на літаратурным фронце, скончылі ролю. У тэй паласе інтэрвэнцыянскіх правакацый, якія зараз гэтак шчыльна аблягаюць межы Савецкага Саюзу, ва ўмовах Беларусі, аднаго з перадавых фарпостаў Саюзу,—клясавая пільнасьць і баяздольнасьць павінна быць даведзена да найвышэйшай ступені. У гэтым адна з асноўных задач савецкай літаратуры і, у першую чаргу, яе перадавога атраду.

Пастанова ЦК адкрывае перад беларускай савецкай літаратурай багацейшыя перспэктывы для разьвіцьця. Трэба разгарнутым фронтам выйсьці на барацьбу за рэалізацыю гэтых пэрспэктыў і ўжо да XV гадавіны Кастрычніка прысьці з вялікімі перамогамі.

За новую працу

Філістэры і заўгольныя шаптуны могуць сіпець зларадна:

— А што, расьпусьцілі? А што, ліквідавалі? **Дакіраваліся?..**

Марна і цалкам непатрэбная рэч—даводзіць што-небудзь нікчэмнаму тупому мяшчанству, але заклеймаваць яго заслужонай пагардай і ганьбай—абавязак кожнага сумленнага грамадзяніна савецкай краіны.

Пастанова ЦК УсеКП—цьвёрды пэўны крок наперад, які ня толькі не адмаўляе дасягненьняў у барацьбе за пролетарскую літаратуру, а замацоўвае іх і на падставе іх адкрывае шырокія прасторы да новае барацьбы і новых перамог.

Хай сіпяць заўгольныя шаптуны—гэта іхны звычны і неаднаёмны жанр,—а мы горача, дружна прывітаем гістарычную пастанову бальшавіцкай партыі і шчырасьць свайго прывітаньня пацьвердзім усёй далейшай літаратурнай працай.

За новую працу! За новыя—сапраўды мастацкія і сапраўды патрэбныя пролетарыяту творы!

Міхась Зарэцкі

Горача вітаю пастанову ЦК УсеКП(б)

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурна-мастацкіх організацый зьяўляецца выдатным гістарычным фактам, які трэба горача вітаць.

Водлуг гэтай пастановы разьвіцьцё пролетарскай літаратуры ўздымаецца на новую вышыню, адкрываючы шлях для яшчэ большых тэмпаў у справе будаўніцтва культуры, соцыялістычнай па зьместу і нацыянальнай па форме.

Ва ўмовах БССР БелАПП праробленна вялікая праца па організацыі беларускай пролетарскай літаратуры, па змаганьні з нацдэмаўскімі плынямі ў літаратуры, па закліку ўдарнікаў і інш.

Аднак БелАПП мела і цэлы шэраг памылковых крокаў у сваёй працы, як недастатковая ўвага да спадарожнікаў, левыя загібы ў крытыцы спадарожніцкай творчасьці, некарыснае напапленьне ярлыкоў і інш. Мелі мейсца адзнакі групаўшчыны і лішніх сварак паміж асобнымі гурткамі і пісьменьнікамі у самой БелАПП. Тым ня менш, гэта ня зьніжае значнасьці і важнасьці белапаўскай дзейнасьці.

Новая організацыя савецкіх пісьменьнікаў, якая будзе організавана, павінна з напружанай энэргіяй узяцца за творчую працу па стварэньню магнітабудаў літаратуры, аддаючы ўсе свае сілы і здольнасьці на соцыялістычнае будаўніцтва, на выкананьне другой пяцігодкі.

Ц. Гартны

В. Шапавалаў

Аграмадныя пэрспэктывы

Пастанова ЦК ад 23/IV і яе рэалізацыя адкрывае аграмадныя пэрспэктывы ў справе мобілізацыі ўсяго фронту савецкай літаратуры на змаганьне за выкананьне гістарычных задач, высунутых XVII парткконфэрэнцыяй і XIV зьездам КП(б)Б, на другую пяцігодку, на змаганьне за ліквідацыю перажыткаў капіталізму ў экономіцы і сьвядомасьці людзей.

Змаганьне за вялікае бальшавіцкае мастацтва ўзьнята гэтай пастановай на новую вышэйшую ступень.

Ні ў якім разе нельга разглядаць пастанову ЦК як адмаўленьне ад клясавага змаганьня ў літаратуры. Гэта змаганьне будзе і павінна весьціся з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю і рашучасьцю.

Тлумачыць пастанову такім чынам, што «мне няма чаго ісьці да пролетарскай літаратуры, гэта літаратура сама да мяне прыйшла», могуць толькі бяспрынцыпныя абывацелі, або сьвядомыя ворагі, якія нічога агульнага са справай змаганьня за пабудову магнітабудаў у літаратуры ня маюць.

Прыезд украінскага Чырвоназаводзкага тэатру—адзнака яднаньня нацыянальных атрадаў мастацтва СССР

Аўг. Рамановіч

Украінскі Чырвоназаводзкі тэатр у БССР

Гастролі Украінскага Дзяржаўнага Чырвоназаводзкага Тэатру па БССР (Менск—Віцебск—Магілеў) — ёсьць з аднаго боку адказ на адозву ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня 1930 г. аб азнаямленьні працоўных мас з росквітам пролетарскай культуры братніх нацрэспублік, з другога боку—гэтыя гастролі зьяўляюцца адказам на гастролі нашага Першага Дзяржаўнага тэатру па УССР (Харкаў—Кіеў) улетку 1931 г.

Беларускаму працоўнаму глядачу асабліва цікава будзе пазнаёміцца з тэатрам Савецкай Украіны, з тэатрам, які нарадзіўся ў дзень дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі (1927 г.), ва ўмовах правільнага праваджэньня ленінскай нацыянальнай політыкі комуністычнай партыяй, па ініцыятыве і пры актыўнай дапамозе рабочых індустрыяльнага Чырвоназаводзкага раёну ў сталіцы УССР—Харкаве (адсюль і назва тэатру — «Чырвоназаводзкі»).

Фактычна наш глядач яшчэ ні разу ня бачыў сапраўднага украінскага рэволюцыйнага тэатру. Тыя, дарэчы—даўно зьнікшыя, «малоросийские» «народные» колектыўчыкі, пад антрэпрызай розных там Сагайдачных і К° «с соизволения начальства», услаўляўшых кулацкую Украіну «з сьпівамі, скокамі, та горілкаю», у стылі «гоп, мае грэчанікі»,—гэтыя адрыжкі старой дарэволюцыйнай «единой, неделимой» царскай Расіі, выгнаныя пасьля рэволюцыі з Савецкай Украіны, яшчэ пэўны час блукалі і ў межах нашай рэспублікі, пакуль разгорнутае соцыялістычнае наступленьне па ўсяму фронту мастацтва канчаткова ня зьліквідавалі іх. Зразумела, што ніякага ўяўленьня аб росквіце украінскай пролетарскай культуры гэтыя «труппы» даць не маглі, ды гэта і не ўваходзіла ў іх задачу. Таму асабліва пажаданым і цікавым зьяўляецца для



Заслужаны арт. УССР Васылько

нас падарожжа украінскага, Чырвоназаводзкага тэатру, які мае ў сваім рэпэртуары не контррэволюцыйны, нацыянал-дэмократычныя «Про шчо Тырса шэлестыла», «Запорожец за Дунаем» і г. д., а тэматыку драматургаў Савецкай Украіны «Кадры»—Мікітэнка, «Штурм» — Корнейчука і г. д., пролетарскай драматургіі іншых братніх савецкіх рэспублік «Страх» — Афінагенава, «Гута» — Р. Кобеца, клясыку—«Слуга двух паноў» Карла Гольдоні, нямецкай рэволюцыйнай драматургіі—Катарскія матросы»—Фрыдрыха Вольфа і г. д.

Карыстаючыся шырокай популярнасьцю сярод працоўных мас УССР, асабліва індустрыяльных раёнаў Харкаву і Донбасу (дзе тэатр гастроляваў у гэтым годзе), дзякуючы вострай актуальнасьці свайго рэпэртуару, здольнасьці простым, але выразным мастацкім прыёмам, пры ўдалым сынтэтычным злучэньні музыкі, руху, слова, данесьці да глядача тыя ідэі, якія акрэсьлены ў яго тэматыцы,—Чырвоназаводзкі тэатр знаходзіцца ў авангардзе украінскіх рэволюцыйных тэатраў, зьяўляючыся мастацкім агітпропам нашай партыі, які ўласьцівымі яму спосабамі, у мастацкіх вобразах, змагаецца за культуру пролетарскай Украіны.

Моцны спаяны колектыў, пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі, таленавітага рэжысэра **В. С. Васылько** і рэжысэрскага штабу т. т. **Канеўскага, Шнэйдэрмана, Лазурэнка** (маладых рэжысэраў-выхаванцаў тэатру), змагаючыся за дыялектычна-матэрыялістычны творчы мэтад, за маркса-ленінскае разуменьне рэчаіснасьці, за апошнія гады, асабліва пасьля Ўсесаюзнай Алімпіады мастацтваў (на якой Чырвоназаводзкі тэатр прымаў удзел) паказаў буйны рост наперад, вырасшы ў вялікі мастацкі організм з орыгінальнымі, яму ўласьцівымі, прыёмамі сцэнічнай інтэрпрэтацыі п'ес, з высокаю акторскаю і рэжысэрскаю тэатральнай культурай. Гэтых посьпехаў колектыў дамогся ў бязьлітаснай клясавай барацьбе, у організчнай штодзеннай сувязі з сваім рабочым гледачом, у шырокім скарыстаньні соцыялістычных мэтадаў працы, соцспаборніцтва і ўдарніцтва (у 1930 г. у лістападзе у г. Віцебску была падпісана першая соцумова з БДТ-1, якая Чырвоназаводзкім тэатрам з гонарам выканана і 5-га студзеня 1932 г. у Менску была падпісана другая, зараз дзейнічаючая, соцумова з БДТ-1).

Сувязь двух нацыянальных тэатраў—беларускага і украінскага—сувязь, якая завязалася на алімпіадзе ў Маскве і якая з кожным днём пашыраецца і паглыбляецца, якая не абмяжавалася толькі падпісаньнем соцумоў, абменам рэпэртуару («Гута» у Чырвоназаводзкім тэатры, «Справа Гонзру» і «Плацдарм» у БДТ-1),—а і перапіскай паасобных працаўнікоў, абменам насьценгазэтамі, літаратурай, пасылкаю спэцыяльных брыгад на новыя пастаноўкі, скарыстаньнем вопыту кожнага тэатру, і, нарэшце, сустрэчай двух колектываў у Харкаве ў 1931 г. і зараз у Менску,—гэтая сувязь шмат дапамагае абодвым тэатрам у справе будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зьместу. Гэткая сувязь магчыма толькі ва ўмовах Савецкага Саюзу, ва ўмовах правільнага праваджэньня ленінскай нацполітыкі.

Чырвоназаводзкі тэатр пакажа нам чатыры свае апошнія пастаноўкі. Сярод іх: п'еса вядомага украінскага пролетарскага драматурга І. Мікітэнкі—«Кадры», якая паказвае барацьбу пролетарыяту за пролетарызацыю ВНУ'т, п'еса расійскага пролетарскага драматурга А. Афінагенава «Страх» на тэму аб клясавай барацьбе ў навуцы, п'еса нямецкага рэволюцыйнага драматурга Фрыдрыха Вольфа—«Катарскія матросы» на тэму аб паўстаньні аўстрыйскіх маракоў у порту Катарро ў 1918 г. і клясычную п'есу К. Гольдоні «Слуга двух паноў», пастаўленую ня ў пляне рэстаўрацыі старога італьянскага тэатру, а ў перапрацоўцы і інтэрпрэтацыі ў сьвятле сёнешняга дню, з мэтаю правільнага выкарыстоўваньня старой клясычнай спадчыны.

Пажадаем посьпехаў Украінскаму Чырвоназаводзкаму тэатру ў яго рабоце.

МАСТАЦКАЕ СЛОВА ПАВІННА СТАЦЬ НА АБАРОНУ САВЕЦКІХ МЕЖ

Л. Бэндэ

Узброіцца супроць ваеннай небясьпекі

(З дакладу на 1-ай літаратурнай конфэрэнцыі пагранахраны і войск АДПУ БССР)

Для таго, каб вызначыць тыя задачы, якія стаяць перад намі, трэба раней за ўсё вызначыць асноўныя рысы тае эпохі, у якой мы жывём.

Мы маем дзьве супроцьлеглыя антагоністычныя сыстэмы—сыстэму капіталізму і сыстэму соцыялізму. Адна з гэтых двух антагоністычных сыстэм—капіталістычная — катастрафічна ляціць уніз, перажывае сьмяротны крызіс, зьмяншае вытворчасьць, зачыняе фабрыкі заводы, з нябачанай і нячуванай сілай у сусьветнай гісторыі, разбурае вытворчыя сілы, выкідвае на брук дзесяткі мільёнаў рабочых, асуджаючы іх на галодную сьмерць, разбурае шматмільённыя масы сялянства, ператварае іх у жабракоў і валацугаў.

У гэты час другая сыстэма—соцыялістычная — няўхільна нябачнымі маштабамі, нябачнымі тэмпамі разгортвае вытворчыя сілы, разгортвае будаўніцтва новых фабрык, новых заводаў, новых домнаў, новых шахт, новых электрастанцый, на аснове найвышэйшай навейшай тэхнікі, на аснове найвялікшых заваёў чалавецтва. Пролетарыят СССР пад кіраўніцтвам партыі Леніна, у жорсткім змаганьні з ліквідуемым кулаком, з рэшткамі капіталістычных элемэнтаў гораду, у жорсткай барацьбе за захаваньне міра, разьбіваючы прароцтвы контррэволюцыйнага тракцізму, адкідваючы хныканьне і зыцьцё правых опортуністаў, выкрываючы іх клясавую сутнасьць—дамогся сусьветна-гістарычных заваёў на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, завяршыўшы фундамант соцыялістычнай экономікі.

Капіталізм, які катастрафічна ідзе да сваёй пагібелі, шукае выйсьця з крызісу шляхам новых імпэрыялістычных войн, шляхам новага перадзелу сьвету, шляхам вайны ў першую чаргу супроць СССР.

Ленін вучыў разглядаць імпэрыялістычныя войны як непазьбежнасьць, якая вынікае з об'ектыўнае сутнасьці імпэрыялізму, як працяг клясавай палітыкі капіталізму другімі сродкамі.

Ленін зучыў, што «Пры капіталізьме, і асабліва яго імпэрыялістычнай стадыі войны непазьбежны» (Т. XIII, стар. 51), бо «вайна ёсьць працяг палітыкі іншымі сродкамі. Усякая вайна непадзельна зьвязана з тым палітычным ладам, з якога яна вынікае. Тую самую палітыку, якую вядомая дзяржава, вядомая кляса ўнутры гэтае дзяржавы вяла ў працягу доўгага часу перад вайной, тую самую палітыку непазьбежна і нямінуча гэтая самая кляса працягвае ў часе вайны, перамяніўшы толькі форму дзеяньня» («Новыя артыкулы і лісты», стар. 35).

Устанаўліваючы тыпы і характары войн, якія характэрны для эпохі імпэрыялізму, (а такімі Ленін лічыў: імпэрыялістычныя войны паміж вялікімі дзяржавамі; нацыянальныя войны з боку колёній і паўколёній; грамадзянскія войны пролетарыяту супроць буржуазіі за соцыялізм; імпэрыялістычныя войны супроць краіны, ў якой перамог соцыялізм. Контррэволюцыйныя войны: «войны краіны, дзе перамог соцыялізм у адной краіне супроць другіх, буржуазных або рэакцыйных бакоў») Ленін ня спыняў падкрэсьліваць, што «мы, марксысты, не належым да ліку бязумоўных праціўнікаў усялякае вайны. Мы гаворым: наша мэта—дасягненьне соцыялістычнага грамадзтва ладу, які зьнішчыўшы падзел чалавецтва на клясы, зьнішчыўшы ўсякую эксплёатацыю чалавека чалавекам і адной нацыі другімі нацыямі, непазьбежна зьнішчыць усялякую магчымасьць войн наогул. Але ў вайне за гэты соцыялістычны грамадзкі лад мы непазьбежна сустрэнем такія ўмовы, калі змаганьне клясавае ўнутры кожнае асобнае нацыі можа стыкнуцца з пароджаемай ім-жа, гэтым клясавым змаганьнем, вайной паміж рознымі нацыямі, і мы ня можам таму адмаўляць магчымасьці рэволюцыйных войн, гэта значыць войн, якія вынікі з клясавага змаганьня, рэволюцыйных войн, якія вядуцца рэволюцыйнымі клясамі, войн, якія маюць простае, непасрэднае рэволюцыйнае значэньне» («Новыя артыкулы і лісты», стар. 34).

Цяперашні момант характарызуецца тым, што як ніколі раней набліжаецца час сканчэньня «гістарычнай перадышкі», гістарычнае разьвязкі ў міжнародным маштабе пытаньня «хто—каго». На сягонешні дзень, як ніколі, небясьпека імпэрыялістычнай контррэволюцыйнай вайны супроць Савецкага саюзу рэальна. Пра гэта гаворыць ня толькі об'ектыўнае становішча рэчаў, але пра гэта адкрыта гаворыць уся міжнародная прэса, служачы якбы вобразным дапаўненьнем да жэнэўскай пацыфісцкай балбатні і «міралюбівых» фраз міністраў. Мы зьяўляемся сёньня сьведкамі крывавых падзей на Далёкім Усходзе, якія зьяўляюцца артылерыйскім акомпонэмэнтам да жэнэўскай конфэрэнцыі па разбраеньні. Мы зьяўляемся сьведкамі далейшага абвастрэньня супярэчнасьцяй паміж імпэрыялістамі на Далёкім Усходзе і, асабліва, абвастрэньня супярэчнасьцяй паміж ПАЗШ і Японіяй, якія спрачаюцца між сабой за панаваньне на Ціхім акіяне. Мы зьяўляемся сьведкамі паглыбленых крызісам супярэчнасьцяй паміж Польшчай і Германіяй, паміж Італіяй і Францыяй, абвастрэньня супярэчнасьцяй на Балканах у даным выпадку ня гледзячы на комбінацыю францускіх імпэрыялістаў. Міжнародная біржа «хоча далейшага абвастрэньня і пашырэньня вайсковых дзеяньняў, яна пры намерна падрыхтоўвае новую сусьветную бойню»—піша «Праўда» за 10-III-32 г., бо Японска-Кітайская вайна ня толькі ня вывела з крызісу капіталізм, а наадварот, яшчэ у большай ступені концэнтравала супярэчнасьці, якія параджаюцца сусьветным крызісам. Праўда японска-кітайская вайна выклікала далейшае ажыўленьне вайсковай прамысловасьці, адзінай галіны прамысловасьці, незачэпленай крызісам. Тав. Молатаў у прамове на пленуме ЦС Асоавіяхіму 3 красавіка гаварыў: «У пошуках выхаду з крызісу пануючыя групы капіталістычных краін усё больш схіляюцца на шлях знадворных авантур, на шлях імпэрыялістычных войн. Ліхаманкавая работа вайсковай прамысловасьці ў капіталістычных краінах, рост у сувязі з гэтым ажыятажу вакол магчымых тлустых прыбыткаў распальвае апэтыты і кідае да вайсковых авантур пануючыя капіталістычныя клікі».

Акрамя ясных і недвухсэнсоўных надзей у падрыхтоўцы вайны супроць СССР буржуазія разам са сваімі лёкаямі—соцыял-дэмократыяй, контррэволюцыйным тракцізмам праводзіць шалёным тэмпам падрыхтоўку вайны супроць СССР.

Соцыял-дэмократыя, замызганая сваімі гаспадарамі, накіроўвае ўсе свае сілы да таго, каб компромэнтаваць Савецкі Саюз, каб абяззброіць пролетарыят капіталістычных краін, каб піхнуць яго на ўдзел у контррэволюцыйнай вайне супроць Савецкага Саюзу бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту. Для ідэолёгічнай падрыхтоўкі вайны супроць СССР, для апраўданьня гэтай вайны, для таго, каб маскаваць сваё соцыял-імпэрыялістычнае рыла, соцыял-дэмократыя, абвяшчае соцыялістычнае будаўніцтва ў СССР дзяржкапіталізмам.

Газэта бэльгійскіх соцыял-фашыстаў «Пепль» 25 лютага гэтага году піша: «З тых часоў, як скончыўся ў Расіі вайсковы комунізм, там насаджваюць не соцыялізм, а дзяржкапіталізм... аднак, мэтоды, якія ўжываюцца савецкай дзяржавай, ня могуць ні ў якай меры прывіцца ў краіне буржуазнай цывілізацыі. Працоўныя іх адкінуць».

Соцыял-фашысты недвухсэнсоўна гавораць працоўным масам пра непатрэбнасьць абароны СССР, пра патрэбу вайны супроць СССР. Ад Заходніх лёкаяў капіталу не адстаюць іх усходнія калегі. Калі заходняя соцыял-дэмократы абвяшчае будаўніцтва соцыялізму дзяржкапіталізмам, а імпэрыялістычную стадыю капіталізма «пераходным пэрыодам да соцыялізму», дык іх усходнія калегі з тым-жа правам, не адстаючы ад іх, абвяшчаюць устанаўленьне монархіі ў Манчжурыі, амаль што не пролетарскай уладай. Вось што пішуць японскія соцыял-фашысты ў газэце «Ніхон Мінсю Сімбун»: «Не дапусьціць таго, каб Манчжурыя, абароненая крывёю пролетарыяту, зноўку стала здабыткам буржуазіі»... «Мы хутка рухаемся ў кірунку будаўніцтва соцыялістычнай Японіі».

І ў паклёпе на Савецкі саюз яны ніколькі не ўступаюць сваім заходнім калегам: «Савецкая пяцігодка,—пісаў Атамацу,—закончаны плян пабудовы дзяржаўнага капіталізму. Такім чынам тое, што завецца Савецкім саюзам у сапраўднасьці ні што іншае, як вялікадзяржаўная расійская дзяржава».

Ленін у свой час сказаў: «Сур'ёзна адносіцца да абароны краіны, гэта значыць сур'ёзна рыхтавацца і строга ўлічваць суадносіны сіл». Зразумела, што ўзмацненьне тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца правільнейшым сродкам узмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу, зразумела, таксама, што трэба яшчэ больш узмацніць дбайнасьць і баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі. Гэта галоўнае. Але нам трэба прасякнуць усе пачуцьці і думкі кожнага працоўнага ўсьведамленьнем таго, што гістарычная перадышка набліжаецца да канца, што небясьпека контррэволюцыйнай вайны супроць СССР—рэальная.

Мы павінны ўзмацніць нашае змаганьне за баяздольнасьць СССР і шляхам такога моцнага аружжа, якім зьяўляецца мастацкае слов. Старая пагаворка кажа: «У часе вайны музы маўчаць», «калі пяюць гарматы, поэзіі няма чаго рабіць». Троцкі ў свой час крычаў, што месца мастацтва «ў гістарычным абозе», меншавік Пераверзеў кажа: «Палітыка нічога ня можа ствараць у мастацтве, і мастацтва нічога ня можа ствараць у палітыцы».

Аднак, калі мы паглядзім на ўсю папярэднюю гісторыю літаратуры, дык убачым зусім адваротнае: усялякая вайна ня толькі ня глушыць музу, а наадварот актывізуе гэтую музу, бо як пануючыя клясы маглі адмовіцца ад такога моцнага аружжа, якім зьяўляецца мастацтва ў такія асабліва вострыя моманты, у моманты, калі патрабуецца напружваньне ўсіх сіл, усяе ўвагі, ўсіх нэрваў на вайну? Адзін з дасьледчыкаў піша: «Мобілізацыйны загад 1 жніўня 1914 г. мобілізаваў мастацтва з такой-жа катэгорычнасьцю, як і ўсё астатняе. Мастацтва перайшло на вайсковае становішча нават хутчэй, чым што-небудзь іншае. Мастацтва ў літаральным сэнсе слова кінулася на праціўніка, які паказваўся, зьверху аднычасова з тымі першымі палкамі, якія экстрэнымі цягнікамі кінуліся да межы».

Мастацтва буржуазіі ня толькі не маўчала, музы ня толькі не замоўклі, але актыўна ўключыліся ў агульны струмень шовінізму ў агульную сыстэму буржуазнай політработы.

Клясы, што ваююць, ня могуць ня выкарыстаць такога аружжа, якім зьяўляецца мастацкая літаратура. Я-б мог прывесьці даволі прыкладаў, якія пацьвярджаюць гэтае палажэньне. Каб не заходзіць далёка ў мінулае, я пакажу толькі на такі факт, што ў часе дальняўсходняй кампаніі ў 1929 г. у Мукдэнскай арміі пачалі распаўсюджвацца вершы, якія заклікалі таптаць савецкую зямлю, калоць і рэзаць рускіх, адсякаць галовы бальшавікам, зьнішчаць Чырвоную армію, і вярнуцца з пераможнымі песьнямі. Гісторыя паказала, з якімі «гучнымі пераможнымі песьнямі» сустрэла кітайская буржуазія сваіх палкаводцаў.

Далей т. Бэндэ спыняецца, на разглядзе таго, як у некаторых пісьменьнікаў пранікаюць у творы буржуазныя ўстаноўкі у пытаньнях абароны краіны і на разглядзе лепшых пролетарскіх поэтаў, якія дапамагаюць узмоцненьню абароназдольнасьці СССР.

Ів. Шапавалаў

Дапаможам пісьменьніку пагранічніку

(З дакладу «Пра заклік ударнікаў у літаратуру і пра формы і мэтады работы на мяжы» на першай літаратурнай конфэрэнцыі пагранахраны і Войск АДПУ).

Асноўнай задачай, якая стаіць перад усёй нашай пролетарскай і савецкай літаратурай, перад чырвонаармейскімі пісьменьнікамі ў прыватнасьці, зьяўляецца аўладаньне дыялектычна-матэрыялістычным творчым мэтадам. Таксама стаіць задача аўладаньня тэхнікай мастацкага слова. І ў тых і ў другіх адносінах мы з вамі кульгаем на ўсе чатыры нагі. Для гэтага ня трэба прыводзіць шмат прыкладаў.

Слаба абстаіць справа і ў адносінах аўладаньня мастацкай формай. Мастацкай формай мы аўладалі далёка ня выстарчальна.

Мне тут даводзіцца спыніцца на некаторых творах. Я вазьму твор тав. Мятлева, які ўзяў на сябе задачу вялікай важнасьці, якую патрэбна браць і далей працягваць і разьвіваць—задачу паказу ўдарніка Сітонава. Тав. Мятлеў піша:

«У разьдзеле аддзяленьне тав. Сінотава лепшае. У дні барацьбы за лепшае аддзяленьне ён вывеў сваё аддзяленьне ў перадавую шарэнгу, за што аддзяленьне атрымала ад КСМ палка грамату.


Многа сіл прыклаў ударнік Сінотаў у адшліфоўцы сваіх байцоў. Баец Воўкаў быў адзін са слабых у дывізіёне.—

— Воўкаў быў дзікуном... Людзей палохаўся,—апавядае комдыў.

Чаго не запытаеш у Воўкава, адказу не атрымаеш, або насупіўшыся нехаця буркне:

— Па чым я ведаю... Я ня ведаю. і г. д.

У гэтым творы тав. Мятлеў, узяўшы вялікую тэму, зьбіўся на пратакольны запіс. Ён апавядае, што рабіў добры ўдарнік Сінотаў, а не паказвае гэтага ўдарніка. Ён не дае нам мастацкага вобразу, з якога-б нам было ясна ну хоць-бы і тое, што ў дні барацьбы за лепшае аддзяленьне Сінотаў вельмі шмат працаваў. Ён гаворыць, мы яму верым, але мы маем права яму і ня даць веры, таму што ён нас не пераконвае паказам. І вось такое «апавяданьне», а не мастацкі паказ зьяўляецца адным з галоўных грахоў нашых ударнікаў у літаратуры на сёнешні дзень. Мы яшчэ ня справіліся з мастацкім вобразам. Ён у нас круціцца і мы яго ня можам злавіць.



ІВ. ШАПАВАЛАЎ

Выключэньне ў гэтых адносінах не складаюць і вершы. Тут ёсьць творы таварышоў з ЗахЛАЧАФ'у, якія гавораць пра тое, што ў нас і ў вершах часта атрымліваецца тое, што вершам гэты твор называецца толькі таму, што там ёсьць рыфма і то часамі няўдалая. Адсутнасьць вобразнасьці цалкам пераносіцца і на нашы вершаваныя творы.

Тут у мяне пад рукамі «Ответное слово» нашага поэта пагранічніка Пятруся Сьмірнова.

День за днём,
Мысли врезались в станок:
«Эй, Туркестан!
Выполним план
Скорей,
Скорей!
Давай хлопок!
Транспорт, і ты не подведи!
Поживее, поживее
Круглыми ногами по рельсам
Турксиба
Фыркая по рысьи
Беги,
Беги,
Беги!

Тут аўтар імкнецца ўзяць вобразы, але гэтыя вобразы сьцёртыя, старыя, яны не даходзяць да чытача.

Я павінен сказаць, што ў справе аўладаньня тэхнікай мастацкага слова, у справе аўладаньня вобразамі, нам з вамі давядзецца вельмі і вельмі шмат папрацаваць.

Але, ня гледзячы на гэтыя недахопы, якія я тут адзначыў, мы на сёнешні дзень з усёй упэўненасьцю і з усёй рашучасьцю можам сказаць, што гэтыя недахопы зьяўляюцца хваробамі росту, зьяўляюцца вынікам нашага, яшчэ вельмі малога вопыту ў гэтай рабоце, вынікам недахопу нашага сьветапогляду і гэтых недахопаў мы, бязумоўна, будзем пры разгортваньні нашай работы пазбаўляцца.

Увогуле, калі ўзяць творы ўдарнікаў, то яны ў вялікай меры компэнсуюцца вялікаю шчырасьцю, вялікай любоўю да свае работы. Гэта відаць на кожным, нават самым маленькім творы. Другая справа, што чалавек на сёнешні дзень яшчэ ня ўмее сказаць як трэба. Душаць яго ў сярэдзіне гэтыя словы, а выліць на паперу сваіх думак ён ня можа. Гэта наша бяда, але бяда, якую мы можам паправіць.

Першаю і асноўнаю ўмовай, неабходнаю для разьвіцьця літаратурнай работы на мяжы, зьяўляецца пералом ўсёй нашай пагранічнай грамадзкасьці да літаратурнай работы. Але такое зьмены мы даб'ёмся толькі ў тым выпадку, калі літаратурныя работнікі нашай мяжы, члены літаратурных гурткоў давядуць, што яны сапраўды зьяўляюцца актыўнымі памочнікамі партыйнай організацыі і командваньня ў справе ўзмацаваньня і аховы дзяржаўных меж мэтадам мастацкага слова. Нам трэба сказаць, што асноўным лёзунгам ударніка ў літаратуры зьяўляецца лёзунг ударніцтва ў ахове мяжы і баявой вучобе. Толькі пры гэтай умове мы можам заваяваць аўторытэт, любоў, увагу і сымпатыю да літаратурнай работы з боку ўсяе нашай пагранічнай грамадзкасьці.

Дапамога мясцовага ЛАЧАФ, мясцовых пісьменьніцкіх організацый зьяўляецца неадлучнай важнейшай часткай нашай работы. Ад гэтай дапамогі ў значнай ступені будуць залежаць нашы далейшыя посьпехі.

З пытаньняў пра дапамогу і падтрыманьня нашай работы непасрэдна выцякае пытаньне пра консультацыю для нашых пачынаючых пісьменьнікаў. Такіх форм консультацыі мы маем прыблізна тры. Першая гэта—выезды на месцы, як работнікаў бюро сэкцыі, так і нашых пісьменьніцкіх брыгад, і ў прыватнасьці брыгад БелЛАЧАФ'у. Другая форма гэта пасылка матэрыялаў гурткоў і гурткоўцаў з месц для консультацыі сюды. І, нарэшце, трэці від кансультацыі—гэта індывідуальнае шэфства нашых пісьменьнікаў над паасобнымі гурткамі і нават над паасобнымі лачафаўцамі.

Асноўным організацыйным зьвяном літаратурнай работы ў пагранахове і войсках АДПУ зьяўляецца літаратурны гурток ў пагранатрадзе, комэндатуры і дывізіёне і г. д. Нам трэба дамагчыся таго, каб нам мець больш-менш сталае кіраўніцтва гурткамі, каб нашы кіраўнікі гурткоў не мяняліся як пальчаткі. Асноўны шлях, па якому будзе знаходзіць выхад творчая продукцыя нашых гурткоў, гэта Ільлічоўка і шматтыражка. Літаратурныя лістоўкі, старонкі, штодзенны ўдзел у Ільлічоўцы—вось поле дзейнасьці для нашых ударнікаў. Трэба будзе выкарыстоўваць паступова і «Чырвонаармейскую праўду» і нашы тоўстыя часопісі.

У справе росту нашых літаратурных кадраў вялікае значэньне будзе мець наша бальшавіцкая крытыка. У нас часта атрымліваецца, што хлапца «крыюць», а ня крытыкуюць. У хлапца знаходзяць кучу сьмяротных грахоў і ў выніку адбіваюць у яго ўсякую ахвоту пісаць. У пытаньнях крытыкі неабходна з жорсткасьцю і рэзкасьцю ў пастаноўцы прынцыповых пытаньняў дамагацца таварыскаму падыходу да пачынаючага пісьменьніка. Для гэтай работы патрэбна прыцягнуць і лепшыя сілы нашай літаратурнай крытыкі.

Калі ў нашай рабоце ня ўдасца наладзіць плянавасьць, то ад гэтага наша работа шмат страціць. Плянавасьць у рабоце гурткоў неабходна будзе ўвесьці для таго, каб паступова расьці, каб не скакаць з аднаго пытаньня на другое, а каб, чапляючыся па чарзе за наступнае зьвяно, падымацца ўверх.

З усёй упартасьцю, настойлівасьцю, мы даб'ёмся таго, што з нашага асяродзьдзя пролетарская літаратура атрымае ў бліжэйшы-ж час моцнае падкованае папаўненьне.

Зьмітрок Астапенка

ПАПЯЛІШЧЫ

(З кнігі вершаў пра Заходнюю Беларусь)

Туман расплываецца над ракой,
Труба пастухова кліча.
Там—за пагоркамі, за раўком
Шэрыя папялішчы.
Адпомсьціце, мужыкі,
Каторыя 'шчэ жывыя!..
За сьветлай лукой ракі.
Жанчына галосіць, вые.
Яна загубіла сваё дзіця,
Што ў жаркім агні згарэла...
Аеры звонкія шалясьцяць,
Гуташацца лоз арэлі.
А ў шэлесьце іх чутно
Роспачнае, страшное—
Паслухайце, людзі,
Крычыць яно—
Бедненькае маё малое!
Ах, сонца лье над ракою кроў,
Дрыготкі туман калыша...
Сяло стаяла на сто двароў,
Засталіся папялішчы.
Там дзедаўскіх хатак стаяў табун—
З царквой і карчмою вёска.
Паны іх спалілі за «страшны» бунт
Супроць рэспублікі польскай.
Труба пастухова пяе, грыміць,
Плача, сьмяецца ў полі.
Хацела сяло працаваць і жыць,
Хацелі сяляне волі.
Адпомсьціце, мужыкі,
За волю сваю і хаты!..
Узмахам паручнікавай рукі
Былі агнём яны ўзьняты.
Жанчына-вар'ятка, не галасі!..
Назад дзяцей ты ня вымаліш.
У цябе засталіся дачка і сын,
Што ўпрочкі пайшлі жывымі.
Туман плыве над дугой ракі.
Вецер ў аёрах сьвішча.
Адпомсьціце, мужыкі,
За шэрыя папялішчы!

Ал. КУЧАР

Уладзімер Хадыка

«Автором руководило стремление собрать воедино противоречия, нагромоздить анахронизмы, чтобы схоронить истину...

... Однако, несмотря на все его усилия, она проб'ется наружу, подобно побегам дикой лозы, мощно пробивающимся среди возделанного виноградника».

Онорэ Дэ Бальзак.

Поэзія Хадыкі цяпер перажывае сур'ёзны крызіс. Гэта значыць—сам поэта хоць у невялікай ступені, але зразумеў, што далей працягваць у творчасьці тую-ж поэтычную лінію немагчыма. Веліч нашае эпохі перакульвае, абвяргае, наносіць сьмяротны ўдар вузкаму сьвету поэты-ідэаліста, які адмяжоўвае сябе ад вялікае творчае, будаўнічае работы.

Раскрыць асновы творчага мэтаду Уладзімера Хадыкі, ускрыць асноўныя ідэёвыя пружыны яго творчасьці —нялёгкая задача, бо філёзофская аснова яго творчасьці схавана пад тканінай вялікшай лірычнай сілы і складанасьці,—вобразаў. Аднак, ісьціна праб'ецца праз гэтую тканіну, выйдзе на паверхню за якімі-б яна пакровамі не хавалася. Гэта разумеў яшчэ такі геніяльны прадстаўнік буржуазнае літаратуры, як Онорэ Дэ Бальзак.

Для Уладзімера Хадыкі, для яго поэзіі об'ектыўная рэчаіснасьць ёсьць такая, што ў яе найвышэйшых «сокровенных» тайнах пазнана быць ня можа. Агульна філёзофская аснова творчасьці Хадыкі—агностычная, ідэалістычная. Поэта рэзка па-канціянску падзяляе сьвет—на сьвет рэчаў для нас і сьвет рэчаў «у сабе». У поэзіі Хадыкі об'ектыўная рэчаіснасьць рэзка падзяляецца на рэчаіснасьць соцыяльную і рэчаіснасьць біолёгічную.

Да пазнаньня рэчаіснасьці Уладзімер Хадыка падыходзіць як ідэаліст. Для яго «фактически дано ощущение, причем внешний мир об'является комплексом ощущений» (Ленін, «Матэрыялізм і эмпіокрытыцызм», стар. 88).

Але вельмі часта поэта робіць уступку агностыцызму — прызнаючы за непасрэдна дадзенае «ощущение»—адмаўляе прынцыповую пазнавальнасьць сьвету па-за нашымі ўспрыяцьцямі.

Тая непасьлядоўнасьць, якая зьяўляецца характарнай для агностыка, вельмі часта характарна і для Уладзімера Хадыкі.

«Он (агностик) **не идет дальше** ощущений,—піша Ленін—**он останавливается по сю сторону явлений,** отказываясь видеть чтобы-то не было «достоверное» за пределами ощущений. **О самих этих вещах** (т. е. о вещах в себе, об'ектах самих по себе) мы ничего достоверного знать не можем,—таково совершенно определенное заявление агностика»... Агностик не допускает **самой мысли** о вещах в себе, заявляя, что ничего достоверного о них мы знать не можем» (Ленін, «Матэр. і Эмпірыокрыт.» стар. 84).

Позыцыя ідэалістычная, агностыцызму зьяўляецца бадай асноўнай для характарыстыкі творчага мэтоду Уладзімера Хадыкі. Хадыка адзіным крытэрыем ісьціны ў сваёй поэзіі абвяшчае свае адчуваньні, няясныя, неакрэсьленыя, псыхолёгічна - хворыя ўсрыманьні, але ў адрозьненьне ад пасьлядоўнага агностыка, за межамі гэтага, ён пакідае вялізарны прастор для існаваньня сьвету ў сабе, сьвету шырокага, таямнічага і непазнанага. Гэтыя творчыя позыцыі пранізвалі і ў большасьці яшчэ і цяпер пранізваюць усю творчасьць Уладзімера Хадыкі.

Сваё бясьсільле перад вялікасьцю сусьвету поэта ўвесь час надзвычайна яскрава разумее—і разуменьне, асэнзнанасьць гэтага бясьсільля,—выступае ва ўсёй складанай тканіне вобразаў.

Прыкрасьці і сэрца болю
Распасьцёрты чорны мошаст.

«Чорны мошаст прыкрасьці і болю» —гэтая ўнутраная хворасьць поэты пераносіцца на об'ектыўную рэчаіснасьць.

Адным з самых цікавых вершаў у творчасьці Хадыкі, дае сконцэнсавана бадай уся сума асноўных ідэёвых праблем яго поэзіі—зьяўляецца верш «У абрыве ноч».

Калі перакласьці гэты верш на мову лёгікі, дык у чым аснова яго лёгічная? У гэтым вершы мы маем ілюзорнае ўяўленьне поэты таго, што нібыта ён пранікае ў няведамы нам сьвет зьяў і рэчаў «у сабе». Гэтае ў вершы выяўлена ў містычным ператварэньні відаць звычайных коняй, якія ідуць па дарозе і кідаюць на мяжу водбліскі падковаў ад капыт—узмрок, які немаведама адкуль бярэ гэтыя падковы «і кідае на мяжу». Гэтае-ж выяўлена ў ператварэньні палёў у могілкі.

Нарэшце да містычнасьці Хадыка даходзіць у сваім імкненьні «пазнаць рэчаіснасьць» па-за межамі нашага быцьця» ў наступных радкох:

У прадоньне мар абсыплецца пясок
—І будзе тло вісець.

У гэтым вобразе поэта даходзіць да своеасаблівай ідэалістычнай агоніі. Вобраз увесь прасякнуты немагчымай празрыстасьцю, абсолютным «отречением» ад усяго матэрыяльнага. Таму, што пясок абсыпаецца ў нешта зусім выключнае па сваёй неадчувальнасьці, няўлоўнасьці—«у прадоньне мар», а далей вобраз яшчэ больш містыфікуецца: у гэтым прадоньні мар «будзе тло вісець».

Мы гаварылі вышэй, што Уладзімер Хадыка рэзка падзяляе сьвет на сьвет соцыяльны і біолёгічны, прычым біолёгічны сьвет зьяў і дзей прымае, адвяргаючы сьвет соцыяльных ідэй (асабліва на этапах творчасьці 1928-29 г.г.). Ён угрунтоўвае біолёгічны крык протэсту, які ідзе ад самае зямлі, ад зьвяроў, якіх выганяюць з бярлогі, ад лясоў, якія сьсякае сякера чалавека, ад кожнага чарвяка, расьліны, і гэтае мы маем у найбольш рэакцыйных формах амаль ва ўсёй творчасьці Уладзімера Хадыкі. Ёсьць яно і ў вышэй згаданым вершы «У абрыве ноч».

З чарвяком—гэтай часьцінкай біолёгічнага сьвету, паэта адчувае сябе, як роўны з роўным.

Часта ў Хадыкі біолёгічны крык протэсту пераплятаецца з бунтарскай, анархічнай, рэакцыйнай позай абароны вёскі ад наступу гораду, рэакцыйнае супроцьстаўленьне гораду вёсцы, сялянства соцыялістычнаму пролетарыяту. У вытлумачэньні гэтае проблемы, проблемы гораду і вёскі Ул. Хадыка ня ўносіць, трэба проста сказаць, нічога новага пасьля Есеніна. Тое-ж, што і ў Есеніна, супроцьстаўленьне вёскі тым «жалезам узброеным людзям», што «аднекуль збоку адыйшлі». «І рэжуць чэрава зямлі, І ломяць лоз старыя грудзі».

Часамі, праўда, вырашэньне гэтага пытаньня пераносіцца ў плошчу тых ідэёвых проблем, якія пастаўлены былі ў свой час у леонаўскіх «Барсуках», дзе селянін анархічны, эсэраўскі, варожы да гораду, узьвялічваецца сваёй мужыцкай сілай, абагатвараецца. Абагатварэньне вёскі, зямлі, селяніна,—які супроцьстаўляецца гораду, пролетарыяту,—набывае ў творчасьці Хадыкі сыстэму, цэльную лінію, зьвязаную з яго сьветапоглядам, з агульнай тэорытычнай і філёзофскай асновай творчасьці.

Зразумела і тое, што ў аснове гэтае няпрыхільнасьці, а то і нянавісьці да пролетарскага гораду ляжаць буржуазна-нацыяналістычныя ідэі, буржуазна - нацыяналістычныя погляды, якія займалі значнае мейсца ў творчасьці Уладзімера Хадыкі.

Але ў гэтым выпадку нас цікавяць, як гэтае рэакцыйнае супроцьстаўленьне вёскі гораду пераплятаецца з біолёгічнасьцю, нібыта адмежаванай ад сьвету соцыяльных ідэй (так думае пра гэта, прынамсі, сам аўтар, мяркуючы па творах). Мы чытаем наступнае:

Ваўкі грызуць шалёны сум,
Кідаюць цёплыя бярлогі.
Дзікліва зграямі ідуць
Шукаюць кватэр, калі дзе знойдуць.
Гушчар на гольлях, як бяду,
Кавалкі поўсьці стане гойдаць...

І от гэты біолёгічны крык, як мы бачым з вершу, яскрава спалучаецца з рэакцыйнымі соцыяльнымі ідэямі—ідэямі супроцьстаўленьня сялянства соцыялістычнаму пролетарыяту.

Падводзячы тут кароценькае падагульненьне сказанаму, трэба канстатаваць цікавае ўзаемадзеяньне і ўзаемасувязь паміж асноўнымі філёзофскімі і ідэёвымі стрыжнямі ў поэзіі Ул. Хадыкі.

Філёзофскай асновай поэзіі Хадыкі зьяўляецца агностыцызм, ідэалізм. Агностычнае прызнаньне «ощущений единственным источником знаний», пакідаючы за межамі гэтага вялікі прастор для канціянскага існаваньня зьяў і рэчаў па-за межамі нашага быцьця. Гэтае агульна-філёзофскае рашчапленьне, раздваеньне сьвету дае і ілюзорнае ў поэзіі, як мы паказвалі ўжо, раздваеньне сьвету—на суму біолёгічных і соцыяльных ідэй. У простай сувязі з гэтым стаіць і супроцьстаўленьне селяніна соцыялістычнаму пролетарыяту, вёскі—гораду, нацыяльнага соцыяльнаму і г. д.

Поўнае філёзофскае адзінства і ўзаемасувязь.

Шарж Дакальскай



Была пара, я марыў быць
Вялікім змагаром...
Я думаў сьвет перарабіць
І мець свой сад і дом
І ў саззе тым, і ў доме тым,
Князёўна дзён маіх...

Ул. Хадыка.

У поэтычных работах Уладзімера Хадыкі элемэнты буржуазна-нацыяналістычнае ідэолёгіі займалі даволі значнае мейсца. Нацыяналістычныя элемэнты выяўляліся ў абстрагаваньні Беларусі (у поэзіі), ад працэсаў клясавага змаганьня, якія на справе адбываліся ў краіне, выражаліся яны ў поэтычным паказе беларускага народу, які нібыта ўвесь ад веку і аж да цяпер—пакутваў, прыгнятаўся, што «ад веку яе нашу родную» Беларусь, «калечны раз'юшаны» польскі пан і жандар.

У балоце жабрачкай галоднаю
Яна памірала ад ран.

«Калечыў яе» і расійскі п'яны ўраднік.

У развагах такога характару элемэнты нацыяналістычных поглядаў на Беларусь, якая нібыта была расьпята крыжавым расійскі і польскім агнём,—сама без'абаронная, прыгнечаная ёсьць

У поэзіі Хадыкі вельмі часта выступае рэзка супроцьстаўленьне нацыянальнага клясаваму. Элемэнты буржуазнага нацыяналізму праяўляюцца і яны зьвязаны з усёй ідэалістычнай філёзофскай і ідэёвай асновай поэзіі Хадыкі, яны праяўляюцца і ў форме супроцьстаўленьня біолёгічнага сьвету—сьвету соцыяльнаму і асабліва яскрава ў форме супроцьстаўленьня вёскі, селяніна—пролетарыяту, гораду.

Маючы такі ідэвы багаж, для Хадыкі рашучы паварот да ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве, паварот да перамаганьня свайго сьветапогляду быў надзвычайна цяжкім і павольным. Але гэты паварот у сваёй аснове быў зроблены яшчэ ў 1930 годзе.

Пералом у творчасьці Уладзімера Хадыкі быў абумоўлены посьпехам соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. І гэты пералом быў не адзіным.

Нашы посьпехі, нашы перамогі над клясавым ворагам прывялі да вялікага зруху ў колах буржуазнае—тэхнічнае старое інтэлігэнцыі. Партыяй і яе правадыром тав. Сталіным гэты зрух быў ацэнены, як наша перамога. Пра гэты зрух тав. Сталін у гістарычнай прамове на нарадзе гаспадарнікаў гаварыў:

«Новая обстановка должна была создать и действительно создала новые настроения среди старой технической интелигенции. Этим, собственно говоря, и об'ясняется тот факт, что мы имеем известные признаки поворота в сторону советской власти известной части этой интелигенции...».

Гэтыя-ж па-сутнасьці процэсы ў іншай форме адбываліся на ўсіх франтох нашага ідэолёгічнага змаганьня. Паварот да задач соцыялістычнага будаўніцтва, да падтрыманьня пляцформы савецкае ўлады быў зроблены і з боку асноўнай масы дробна-буржуазных або тых, што былі яшчэ ў моцным палоне буржуазнае літаратуры—пісьменьнікаў. От посьпехі нашага соцыялістычнага будаўніцтва—абумовілі паступовы адыход Уладзімера Хадыкі ад буржуазнае літаратуры, ад буржуазнага нацыяналізму.

Зрухі ў творчасьці Уладзімера Хадыкі перш за ўсё вызначыліся ў яго актыўным выступленьні супроць ворагаў савецкае ўлады: замежных і ўнутраных: шкоднікаў, контррэволюцыйных нацыяналістаў і інш. Гэты паварот да актуальных задача савецкае ўлады ў змаганьні з клясавым ворагам, суправаджаўся бязумоўна і зрухам у асновах творчага мэтаду: у нязначным яшчэ, але адыходу ад агностыцызму, ідэалізму, хаця старая містыфікаваная форма далёка ня зьнікла яшчэ і тут.

Супроць «драпежнае чарады» нашых ворагаў, супроць «худых рыцараў чужых прыгод» (хто скіраваў на брудны троп аглоблі), супроць «плюгавых вусеняў», супроць гэтых ворагаў Хадыка выступіў поўны нянавісьці, агню і полымя.

Але паказальным зьяўляецца, што ў сваім змаганьні праз вобразнае слова, праз поэтычнае слова з клясавым ворагам Ул. Хадыка, яшчэ амаль цалкам у палоне тае містыфікаванае формы выяўленьня, якая была ў яго на мінулым этапе яго поэзіі. Сьведчыць яно, па-першае, пра тое, што поэта яшчэ дужа моцна знаходзіцца ў палоне мінулага і, па-другое, што мімаволі ён прымушаны «знутры» ўзрываць сыстэму сваіх асноўных ідэёвых поглядаў.

Ул. Хадыка піша пра нашых ворагаў, як пра «музык воўчага ігрышча», якія і гугнявяць, паўшы на калені. Воўчы псальм на здань сваіх маркот

Так піша ён пра варожыя нам сілы, але і ў вершы «У абрыве ноч» і «Сярод дарог»—гэтыя «воўчыя псальмы» зьяўляюцца ўнутраной неабходнасьцю самога поэты. Сам Хадыка музыкам на «воўчых містычных ігрышчах» быў надзвычайна доўга, а часамі і цяпер прарываюцца ў яго поэзіі ноты журботныя гэтага «воўчага ігрышча». Або, калі ўзяць нават апошні ягоны зборнік «Праз жыцьцё працетае» дык і тут зьвярыны фізыолёгічны крык пратэсту, які характэрны для пройдзенага этапу поэзіі Хадыкі, яшчэ жыве:

І пабеглі за багну ад жаху
Дзікіх мес і свавольства цары.
Каб ня бачыць апошняга шляху,
Каб ня чуць негаданай пары.

Новыя дарогі, ў поэзіі Хадыкі вызначылі і новыя адносіны да вёскі, да селяніна. У поэты вызначыліся элемэнты адыходу ад ідэалізацыі старое вёскі, убогае, прыгнечанае. Ён хоча, што-кольвек сказаць пра колгас, пра сувязь гораду і вёскі і інш. Але з новых вершаў яскрава відаць, што сутнасьць нашых колгасаў, сутнасьць тых новых процэсаў, якія здбываюцца на вёсцы, поэта зразумеў недастаткова. Таму, з боку мастацкага, вершы на гэтыя тэмы часамі бываюць слабейшымі. Няма тае лірычнае сілы і глыбіні пранікненьня ў рэчаіс-

ТРЫБУНА ТВОРЧАЙ ДЫСКУСІІ

П. Скокаў

„Брыгадзіры апавяданьні“ Кузьмы Чорнага

Выхад «Брыгадзіравых апавяданьняў» набліжае Кузьму Чорнага да позыцый пролетарскай літаратуры. Гэтая кніга ёсьць факт рашучага павароту аўтара ў бок новай тэматыкі, новага творчага мэтаду.

Калі ў папярэдніх творах Кузьмы Чорнага знаходзіў сваё мастацкае абагуленьне ідэалізм (гл. яго «Апавяданьні», «Срэбра жыцьця», «Пачуцьці», роман «Зямля» і інш), дык зборнік «Брыгадзіравы апавяданьні» адзначыў вялізарны паварот аўтара ў бок перагляду свайго ранейшага ідэёвага «багажу», пераацэнкі «ранейшых каштоўнасьцяй».

Кузьма Чорны ва ўсю веліч ставіць і вырашае проблему выкананьня і перавыкананьня пляну на прадпрыемстве. Аўтар у самых характарных дэталях разгортвае высока-мастацкі паказ працы, змаганьня за выкананьне плянавых заданьняў і на гэтым фоне паказвае комсамол і рабочую моладзь (апавяданьні «Броня Казакевіч», «Рамонтная брыгада» «Браты»).

Вобразы старых рабочых, цяпераншніх перадавых ударнікаў Весялоўскага, Гімпалевіча і Явіча—франтавікі грамадзянскай вайны,—гэта ня схэмы, гэта вобразы сапраўдных змагароў, паданых аўтарам у процэсе ўсяго іх разьвіцьця. Весялоўскі—змагар на франтох грамадзянскай вайны. На фронце грамадзянскай вайны Весялоўскі сустрэўся з Гімпалевічам, Вінгелем, былі ў бойках, у барацьбе, пражылі гады змаганьня з нямецкімі, белапольскімі окупантамі і бандытызмам.

Зараз Вінгель каля варштату. Ён упарта бароніць парадак і бальшавіцкія тэмпы ў цэху. «Я гавару, таварыш, што я цяпер павінен стаяць за тое, што трымаю ў руках?» Ён прапануе: «Першае—заступаць зьмене пасьля зьмены адразу, ня спыняючы варштату, каб работа ішла круглы цэлы дзень. Другое—увесь цэх, скажам, разьбіць хутчэй на ўдарныя брыгады і кожная брыгада, каб мела, скажам, сваю перадатачную брыгаду зьверху, а гэтак сама і зьнізу. От, скажам, брыгада такарнага цэха мае сваю папярэднюю брыгаду ў ліцьцёвым, а пасьля ў зборачным». Вінгель у цаху організоўвае вытворчыя манэўры, становіцца на чале іх, і разумее гэтую справу не як кампанію, а як сыстэматычную ўпартую работу. Проблема мастацкага паказу моладзі, як адна з актуальнейшых проблем, займае вялізарнае мейсца ў творчым пляне кнігі «Брыгадзіравы апавяданьні».

Моладзь К. Чорнага гэта ня тая моладзь, якой уласьціва пасыўнае сузіраньне соцыялістычнай рэчаіснасьці. Гэта—моладзь, інтарэсы якой выцякаюць з задач, якія перад рэволюцыйнай моладзьдзю паставіла партыя.

*Вось вобраз Броні Казакевіча, цэн*тральнай фігуры двух апавяданьняў «Броня Казакевіч» і «Рамонтная брыгада». У мінулым—гэта сын селяніна бедняка, абрабаванага белапольскімі окупантамі,—Броня Казакевіч зараз малады рабочы чугуна-ліцейнага заводу. Ён усьвядоміў свае клясавыя задачы і, стаўшы на шлях актыўнага ўдзелу ў соцбудаўніцтве—непахісны. Яго імкненьне—аўладаць тэхнікай вытворчасьці, змагацца за якасьць продукцыі. Ён ініцыятар організацыі брыгады для дапамогі свайму прымежнаму калгасу ў падрыхтоўцы сельскагаспадарчага інвэнтару. Ён дабіваецца паездкі ў колгас, а з ім два кавалі з яго кавальнага цэху, яго таварышы Косьця Сыматовіч і Гірка Ерынгроз. Брыгада працуе чатыры дні «а пяты апошні дзень працы скончыўся вельмі позна, але за тое колгаснае прыладзьдзе, якое льга было папраўляць у кузьні, было гатовае хоць ты яго цяпер-жа пускай у работу. Брыгада назаўтра паехала. І ў той-жа дзень дзесяць гаспадароў прыйшло запісацца ў колгас».

Аўтар дае мастацкі малюнак усёй зьмены псыхікі. На вобразе Казакевіча Чорны разгортвае паказ таго, як чалавек, перарабляючы асяродзьдзе, перарабляе і самога сябе.

Чорны без павярхоўнага фактаграфаваньня, а на аснове глыбокага асмысьленьня паўнаты працэсу паказ-



вае барацьбу моладзі з безгаспадарчасьцю, з небясьпекай прарыву. Малады ўдарнік Рома Даўгінскі на аснове ўсёй сваёй практыкі зразумеў рэнтабельнасьць расстаноўкі рабочай сілы, мэханізмаў і тыя прычыны, якія прыводзяць прадпрыемства да прарываў. Небясьпеку прарываў ён імкнецца прадбачыць і папярэджвае таварышоў:

«Раз прарыў зьнішчаны, дык ужо і забыцца на яго трэба? А ў нас што робіцца? Робіцца тое, што раз толькі ганьба прарыву над каркам ня вісіць, раз яна вочы ня муляе, дык і пачынаецца, дык і пачалося адразу калупаньне. Нікому і ў галаву што калі гэтакае будзе, дык зноў прарыў будзе і зноў як гара плечы прыдавіць. Калупаньне ў нас пачалося, таварышы. Калупацца пачалі, а не рабіць. І ня толькі гэта некаторыя старыя ініцыятары тут, а і маладыя гэтак сама».

Аднак, Чорны на працягу ўсіх апавяданьняў ня выкрыў карэньні, не паказаў усёй сыстэмы прычын прарываў. У гэтым выпадку Чорны ня вызваліўся ад мэханістычнага падыходу да складанага процэсу.

«Рабілі сабе на заводзе, рабілі; хто рабіў, а хто калупаўся; але на другі год пяцігодкі раптам дайшло да вушэй як з грому: прарыў! І пашло рваць страшэннае слова. Нават не прарыў ужо гаварылі, а правал».

Вось гэтае «раптоўнае» зьяўленьне прарыву застаецца нераскрытым у сувязі нават з галоўнейшым недахопам заводу. Такія недахопы ў рабоце прадпрыемства, як недастатковае ўкараненьне гасразьліку, нездавальняючая пастаноўка праверкі выкананьня, адарванасьць кіруючых органаў ад прадпрыемства, недахопы ўнутры заводзкага плянаваньня, абязьлічка ды іншае, не знайшло свайго мастацкага выкрыцьця ў кнізе «Брыгадзіравы апавяданьні». У гэтым адзін з асноўных недахопаў яе.

З другога боку быт рабочай моладзі па-за заводам атрымаўся схэматычным (гл. апавяданьне «Браты» ды інш). Шматграннасьць быту, здавалася, павінна атрымаць сваё вырашэньне ў творчым пляне апавяданьня «Браты», у сапраўднасьці апавяданьне концэнтруе ўвагу на момант паводзін герояў на прадпрыемстве, у брыгадзе, у цэху і спрошчана кранае пытаньне работы і быту па-за заводам. І Хана, і Гурык, і Казя паказаны аўтарам актыўнымі працаўнікамі на заводзе. Яны ўключаны ў агульны струмень заводзкага жыцьця і ўпэўнены, што ўсё старое, закасьцянелае, як у працы, гэтак і ў быту. «Усё гэта змыецца неўзабаве, разам з усёй іншай нарасьцю, якую змывае рэволюцыя, і якая нарасла на нас за доўгія вякі...», усё-ж гэтыя маладыя рабочыя адарваны аўтарам ад тэй конкрэтнай грамадзкай работы, якую праводзіць заводзкі комсамол і рабочая моладзь па-за заводам.

Няправільным сьцьвярджаць, што «Брыгадзіравы апавяданьні», адзначаючы паварот аўтара, пазбаўлены памылак. Не. Адначасна-ж гэты зборнік апавяданьняў выяўляе рад ідэолёгічных памылак Кузьмы Чорнага, слабых месц у яго падыходзе да паказу рэчаіснасьці.

Падаючы, прыкладам, малюнак перажываньняў прагульшчыка, на якога скоса пазіраюць астатнія рабочыя, Кузьма Чорны піша:

«Пархвіненька цяпер ужо нічога не гаварыў: усіх не перапрэш. Ён адно маляваў, раз-по-разу даставаў з кішэні папяросы і, пацягнуўшы разы са два, кідаў і даставаў новыя. Губы дрыжэлі і зубы поўзалі па іх. Пасьля, як не хапіла папярос, ён пачаў усё даставаць з кішэні насатку і смаркацца: чмыхне—і зноў схавае насатку, пасьля раптам дастане і зноў чмыхне». Так паказвае процэс перараджэньня прагульшчыка Пархівенкі Чорны ў апавяданьні «Мадэльшчык Пархвіненка». Апісанае адбываецца пасьля таго, як два-тры рабочыя з таго-ж прадпрыемства зрабілі Пархвіненку пару гіронічных заўваг аб цесначе нагавіц і аб «эўропэйскім дзядзьку». На гэтым аўтар палічыў патрэбным паставіць кропку і апавяданьне скончыць тым, як «Пархвіненка стаяў *крукам на рабоце»,* нават па дзьве зьмены на працягу некалькіх дзён, а пасьля ўсяго гэтага атрымаў прэмію. Аўтар не паказаў тут процэсу пераробкі чалавека. Па-першае, таму, што Чорны не разгортвае перад чытачом шырокага паказу соцыялістычных форм працы на прадпрыемстве, па-другое, аўтар апавяданьня ня ўгледзіў, як рабочыя на прадпрыемстве на аснове соцыялістычных форм і мэтодаў працы вядуць барацьбу «супроць навыкаў і звычак, якімі заразілі іх вякі мяшчанскага гнёту» (М. Горкі). Інакш кажучы, Чорны не паказаў, як рабочыя ў соцыялістычнай пераробцы сьвету соцыялістычна перавыхоўваць сябе. Засталіся па-за ўвагай аўтара ў паказе процэсу перавыхаваньня прагульшчыка і такія асноўныя асяродкі організацыі работы на прадпрыемстве, як партыйная і комсамольская організацыі. Нам няма патрэбы даводзіць ролі гэтых організацый у перавыхаваньні рабочых, але ў апавяданьні «Мадэльшчык Пархвіненка» гэтая роля не знайшла свайго мастацкага абагульненьня, што, бясспрэчна, зьяўляецца вялізарным прарывам, політычнай памылкай аўтара.

Вось галоўныя недахопы «Брыгадзіравых апавяданьняў» Кузьмы Чорнага. Аднак, пры ўсіх недахопах зборнік апавяданьняў К. Чорнага больш-менш поўна і правільна паказвае жыцьцё і працу рабочых, работу нашай моладзі на вытворчасьці. Адначасна гэтая кніга—факт вялізарнага росту самога аўтара, факт яго перабудовы. Трэба сказаць, што перабудова Кузьмы Чорнага, набліжэньне яго да позыцый пролетарскай літаратуры ідзе не па «шляху найменшага супраціўленьня, а па шляху ўпартага вызваленьня ад уплываў ідэалістычнага мэханіцызму, дробнабуржуазнай романтыкі, у бок аўладаньня дыялектыка-матэрыялістычным мэтадам.

Язэп Карпашэвіч

Пра дзьве кніжкі Міхася Лынькова

Апошнія творы Міхася Лынькова гавораць пра вялікі рост яго як пролетарскага пісьменьніка, пра пасьпяховае прасоўваньне наперад па авалодваньню творчым мэтадам пролетарскай літаратуры—матэрыялістычнай дыялектыкай, зьяўляюцца паказальнікам яго імкненьняў шчыльна ўключыцца ў тэматыку рэконструкцыйнага пэрыоду.

Апавяданьне «Андрэй Лятун» было напісана Лыньковым яшчэ ў 1928 годзе. Друкавалася яно ў часопісі «Маладняк», потым вышла асобнай кніжкай двумя выданьнямі. Але нашай крытыкай не былі своечасова і дастаткова ўскрыты памылковыя творчыя ўстаноўкі гэтага апавяданьня, а гэта асабліва патрэбана, бо і да гэтага часу некаторыя з іх яшчэ, відаць, недастаткова асьвядомлены пісьменьнікам, не пераможаны ім, перашкаджаюць яго далейшаму творчаму росту. Даць вобраз старога рабочага, які аддана працуе на чыгунцы, ускрыць яго адносіны да навакольнага, яго ідэолёгію—вось, на наш погляд, асноўная тэма гэтага твору. Як удалася аўтару гэта тэма?

Асноўная памылка апавяданьня «Андрэй Лятун» зьяўляецца тое, што Лынькоў, спыняючыся на псыхолёгіі тых ці іншых дзейных асоб, а асабліва на цэнтральнай фігуры твору—Андрэі, адрывае гэтых людзей ад грамадзкага жыцьця, ад грамадзкага жыцьця, ад барацьбы іх клясы,—пролетарыяту, ня спыняецца на іх поглядах, на тых зьменах, якія адбываліся ў іх пасьля Кастрычніка. Паказваючы чыгуначную станцыю, Лынькоў абсолютна ня спыняецца на рабоце партыйных комсамольскіх, профсаюзных організацый (яго героі нават пра гэта ня ўспамінаюць). У творы і слова не гаворыцца пра тыя вялізарныя зьмены, якія адбыліся ў нашай краіне, а, значыць, і на чыгуначнай станцыі Лынькова пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі. У гэтым творы не адчуваецца дыктатура пролетарыяту, таго, што рабочая кляса будуе соцыялізм—так сказаў студэнт рабочы-рабфаковец! І з ім цяжка не згадзіцца. У выніку гэтага атрымліваецца тое, што станцыя ізолявана ад усяго навакольнага жыцьця, да яе не даносяцца подыхі пролетарскай рэволюцыі. Тое самае атрымліваецца і з людзьмі. Лынькову ў асобе Андрэя Сапуна ўдаецца паказаць адданасьць, замілаваньне да працы, любоў да машыны. Але, адрываючы гэтую дзеючую асобу ад грамадзкага жыцьця, ад барацьбы яго клясы (ня выратоўваюць гэтага палажэньня ўспаміны Сапуна пра тое, што ён выратаваў цягнік ад банды), Лынькоў ня здолеў ускрыць тых сапраўдных прычын, якія формуюць псыхоідэолёгію Андрэя Сапуна. У выніку гэтага атрымліваецца памылковае ўражаньне, што не ў процэсе грамадзкага жыцьця і клясавай барацьбы формуецца яна, а толькі ў адносінах да машыны, у любоўным станаўленьні да яе, на што асабліва націскае Сапун у сваіх разважаньнях пра сэнс жыцьця, пра адносіны да чыгункі. Гэта прыводзіць таксама да таго, што ў асобе Сапуна аўтар ня здолеў паказаць тэй вялікай розьніцы ў адносінах да працы, да вытворчасьці, якая ёсьць паміж капіталістычнай краіны і рабочым краіны Саветаў, ня здолеў паказаць ідэёва-політычны рост рабочае клясы. Сапун выступае перад намі як чалавек, які, незалежна ад улады, надзвычайна добра ставіцца да сваіх абавязкаў да машыны, які і пры царызме быў «лятуном». Разрыў паміж псыхолёгіяй яскрава выступае і ў паказе астатніх рабочых-чыгуначнікаў. Аўтар забывае на тое, што мы жывём у пэрыод найвострай клясавай барацьбы. Ён паказвае чыгуначнікаў схэматычна, як адзіную монолітную масу, якую зьбліжае (у паказе Лынькова) не аднолькавасьць клясавых інтарэсаў (пра гэта ў творы не гаворыцца), а любоў да чыгункі. Вось вынікі няправільнага падыходу да распрацоўкі тэмы.

Зусім інакшы малюнак уяўляецца нам пры аналізе аповесьці Лынькова «Апошні зьверыядавац». Ужо сам выбар тэмы аповесьці—імкненьне паказаць клясавыя карэньні шкодніцтва, контррэволюцыйную дзейнасьць шкоднікаў, моц рабочае клясы і яе партыі, якая бязьлітасна адмятае, зьнішчае клясавага ворага, пад якой-бы маскай ён не хаваўся-б—сам па сабе зьяўляецца фактам дадатным, фактам, які шмат гаворыць пра ідэёвы рост пісьменьніка. Праўда, трэба адзначыць, што твор «Апошні зьверыядавец» напісаны Лыньковым параўнальна вялікі час таму назад. Гэта, бязумоўна, накладае адпаведны адлюстровак на ўвесь твор, гэта павінна прымацца пад увагу пры яго аналізе, але гэта ні ў якай ступені ня зьніжае актуальнасьць падзей, што адбываюцца на гуце, аўтар галоўную ўвагу накіроўвае на паказ барацьбы са шкодніцтвам, на паказ барацьбітоў з ім. У актыў гэтага твору трэба таксама запісаць стварэньне глыбокага вобразу партыйца Кавэдлы. Праўда, трэба адзначыць, што Лынькову не ўдаецца паказаць дыялектычнага разьвіцьця гэтага вобразу, не ўдалося паказаць, як з сына рабочага выхаваўся партыец, бальшавік Кавэдла. Аўтар не паказаў таго асяродзьдзя, якое выхавала Кавэдлу, не паказаў індустрыйны пролетарыят.

Галоўнай памылкай твору трэба лічыць тое, што Лынькоў гуту, узятую ў аповесьці, абсалютна ізолюе, адрывае ад усёй навакольнай рэчаіснасьці, усё падзеі на ёй падаюцца бяз сувязі з навакольным жыцьцём. Гэта прыводзіць да таго, што чытач не разумее, чаму на працягу пяці год шкодніцкай чыннасьці Граеўскага ні раённыя, ні акруговыя партыйныя, профэсыянальныя і савецкія організацыі абсолютна ня цікавіліся становішчам гуты, яе работай. У чытача нават узьнікае пытаньне, ці існавалі такія організацыі? Атрымліваецца ўражаньне, што гута знаходзіцца на нейкай бязьлюднай высьпе. Гэта прыводзіць да таго, што аўтар об'ектыўна змазвае партыйнае кіраўніцтва заводам. У паказе Лынькова адсутнічае на гуце партыйная ячэйка, ня гледзячы на тое, што там працуе больш за трыста асоб, шкоднікі зусім адкрыта на працягу пяці год праводзяць сваю контррэволюцыйную работу. Другія магчымасьці паказаць кіраўніцтва партыі таксама не выкарыстоўваюцца Лыньковым. Концэнтруючы ўсю сваю ўвагу ў барацьбе са шкоднікамі, амаль што выключна на фігурах Кавэдлы і Яшкі, аўтар зусім забывае пра тое, што ім выведзены яшчэ два комуністы, але работы іх зусім не паказвае. Аўтар таксама ўспамінае пра партыйную ячэйку, якая існуе ў суседнім саўгасе, у якую ўваходзяць партыйцы гуты, але не паказвае яе работы. Аддаючы даніну шаблёну, Лынькоў сакратара ячэйкі робіць стопроцантным опортуністам. Нават і ня лічыць патрэбным успомніць, паказаць працу іншых партыйцаў. І яны выступае перад намі абязьлічанай масай. Шаблённа, схэматычна пададзены вобраз сапраўднага Гарашчэні.

Ня гледзячы на памылкі, дапушчаныя Лыньковым у яго творах, такія творы, як «Апошні зьверыядавец», даюць нам упэўненасьць, што з узьнятымі пытаньнямі Лынькоў справіцца пры ўмове жорсткай бальшавіцкай крытыкі яго творчасьці.

Гомель.

насьць, якая характэрна для ўсяе поэзіі Хадыкі.

Пісьменьніку здаецца, што супярэчнасьць паміж вёскай і горадам, супроцьстаўленьне вёскі—гораду ў яго ліквідавана.

У росных травах я не патушу
Ліхтароў ад тропу гарадзкога...

Калі-ж уважліва прасачыць за апошнімі творамі Хадыкі, дык мы бачым, што гэта яшчэ ня так, што гэта проста ўяўленьне, «самаабман» поэты. Яшчэ жыве узьвялічваньне сялянскага, анархічнага, падыход да зьяў рэчаіснасьці з суровай «сялянскасьці». Нават змаганьне з нашымі ворагамі вядзецца Хадыкам з пункту гледжаньня гэтае «сялянскасьці»:

Каб нораў збродны (ценям звыклы)
Пранесьці злыдні не маглі.
Уздымалі злосьнікі на іклы
Кашулю зрэбную зямлі...

У простай сувязі з супроцьстаўленьнем вёскі—гораду ў поэзіі Хадыкі стаяць і элемэнты аполёгетычных адносін да кулацтва. У вершах «У зялёным адвячорку» гэта выяўляецца найбольш яскрава. У вершы даецца малюнак зьбіраньня хмар, надыходу навальніцы, грому.

«Плакала на дубе скрыпка галасістая», «стукалі па даху сьлёзы дробнай кропляю», і тут-жа, сярод створанай атмосфэры навальніцы, грому, тут-жа адзінокі, пакінуты ў полі кулак «б'е па шляху мокраю пантоплю».

Віў на долі горкай,
Каб жыцьця ня бачыла...

Поэта знарок кулака ставіць у такія поэтычна-вобразныя абставіны, што ўсё тут гаворыць на карысьць «беднага, пакінутага, адзінокага кулака».

У тых вершах, дзе Уладзімер Хадыка прабуе гаварыць пра нашы колгасы, пра тыя новыя процэсы, якія адбываюцца ў краіне, дужа часта ён гаворыць пра іх павярхоўна, абстрагавана, неконкрэтна, хаця гэта не супярэчыць таму, што пералом у поэзіі Хадыкі выводзіць яго на шырокае поле новых глыбокіх і вялікіх ідэй, без якіх замкнёная ў сьвет містыкі, ідэалізму яго поэзія ішла да гібелі. Прыкладаў абстрагаванасьці і непераканаўчасьці багата ў вершах апошняга часу, багата і пасывізму, не актыўных адносін да рэчаіснасьці.

Іду я ніцы ля трыйсьця,
Праходжу гурт палян...
Над краем горды вольны сьцяг
Рабочых і сялян.

Аднак ня гледзячы на ўсё вышэйадзначанае, Уладзімер Хадыка зрабіў першы рашучы крок ад буржуазнае поэзіі да ўдзелу ў нашым соцыялістычным будаўніцтве. Пра гэтае проста і надзвычайна глыбока сказаў ён у наступных радкох:

І цяпер, калі спалены мох
На прастрэленым сьвету абліччы,—
Стану сьціпла і строга ў вякох,
Выйду ў сівер эпох політычных...

Першы рашучы крок Уладзімера Хадыкі ад сьвету містыкі ў сапраўднае жыцьцё, жыцьцё плошчы і крыві нашае эпохі,—было выхадам у сьвет шырокіх пэрспэктыў, у сьвет шырокіх політычных тэм і ідэй.

Уладзімер Хадыка зьяўляецца сёньня адным з самых выдатных прадстаўнікоў беларускае лірычнае поэзіі.

У чым-жа мастацкая, поэтычная сіла Уладзімера Хадыкі, як гэта сталася, што поэта, які толькі што пачынае вызваляцца ад свайго ідэалістычнага сьветапогляду, змог дасягнуць такое поэтычнае сілы і чым наогул вымяраецца гэтая поэтычная сіла?

Крытэрыем мастацкасьці таго ці іншага твору мы лічым тое, наколькі мастак раскрыў існыя бакі рэчаіснасьці, наколькі ён ведае гэтыя існыя бакі рэчаіснасьці, наколькі ён іх адчуў, вывучыў, назваў, перажыў.

У гэтых адносінах, пытаньне становіцца ясным, калі мы прадумваем геніяльныя радкі У. І. Леніна пра гэтае пытаньне ў яго артыкуле пра кніжку Аверчанкі: Вось што піша У. І. Ленін:

«Интересно наблюдать, как до кипения дошедшая ненависть вызвала и замечательно сильные и замечательно слабые места этой высокоталантливой книжки. Когда автор свои рассказы посвящает теме ему неизвестной, выходит не художественно».

«Зато большая часть книжки посвящена темам, которые Аркадий Аверченко великолепно знает, пережил, передумал, перечувствовал. И с поразительным талантом изображены впечатления и настроения представителей старой, помещичьей и фабрикантской, богатой, об'евшейся и об'едавшейся России...

«Огнём пышащая ненависть делает рассказы Аверченко иногда—и большей частью—яркими до поразительности».

Далей У. І. гаворыць, што Аверчанка ўздымаецца да сапраўднага пафасу там, дзе ён паказвае яму добра вядомае, перажытае і адчутае, тое што ён ведае. «Знание дела и искренность—из ряда вон выходящее» (Ленін, т. XXVII).

Тое, што Уладзімер Хадыка перажыў, адчуваў, выпакутваў, там, дзе ён яскрава ў межах ідэалістычнага сьветапогляду, бачыць увесь жах перад рэчаіснасьцю, жах перад рэчаіснасьцю абумоўлены яго клясавай прыродай буржуазнага інтэлігента, там, дзе ён адчувае, што буржуазны сьветапогляд вядзе да пагібелі, да вырадженьня—там ён выступае, як буйны мастак.

Аднак гэта толькі там, дзе поэзія Хадыкі не становіцца на шлях рэакцыйны ў дачыненьні да рэчаіснасьці, там-жа, дзе Хадыка становіцца на абарону кулацкіх рэакцыйных сіл, на абарону рэакцыі,—там ён зьбіваецца з сапраўднае мастацкасьці, творы яго становяцца менш мастацкімі. Тое, што ў межах ідэалістычнага сьветапогляду Ул. Хадыка, як мастак узьнімаецца на вялікую вышыню, не супярэчыць аднак наступнаму.

Ідэалістычны сьветапогляд скоўвае і ідэёвыя і мастацкія магчымасьці такога буйнага поэты, як Ул. Хадыка, гэты ідэалістычны сьветапогляд (калі яго поэта ў як мага кароткі тэрмін ня зможа перамагчы), вядзе поэзію Хадыкі ў бязвыходны тупік, вядзе яе да катастрофы, бо за ідэалізм чапляюцца цяпер усе рэакцыйныя элемэнты нашай краіны. І вось чаму першыя яшчэ крокі поэты ад ідэалістычнага сьветапогляду ёсьць ужо факт для яго творчага росту надзвычайнае важнасьці, бо гэтыя першыя крокі даюць яму выхад у сьвет вялікіх проблем, вялікіх чалавечых пачуцьцяў і ідэй.

Наша задача, задача ўсяе савецкае літаратуры змагацца супроць поэзіі Хадыкі там, дзе яна выступае ў сапраўды рэакцыйных формах і дапамагаць поэту там, дзе ён робіць крокі да ўдзелу сваёй творчасьцю ў практыцы соцыялістычнага будаўніцтва, з тым, каб Хадыка апынуўся цалкам у нашых шэрагах.

А трэба адкрыта сказаць, што покуль што там, дзе поэта імкнецца паказаць клясавае змаганьне ў нашай краіне, колектывізацыю і інш., вельмі часта адчуваецца недастатковасьць сьветапогляду, недастатковая прадуманасьць, недастатковае адчуваньне, захапленьне пафосам нашага будаўніцтва, і атрымліваецца або мала-мастацка, або гіронічна на адрас гэтага будаўніцтва.

Калі поэта зможа сапраўды адчуць, перажыць, перадумаць, пераканацца, вывучыць, убачыць поэтычную веліч нашага будаўніцтва, ён тады з містычнага тупіка свае поэзіі выйдзе ў шырокі простор тэм, фарбаў, багацьцяў, думак і адчуваньняў будаўніка бяскласавае соцыялістычнае грамады і тады яго песьні на новай глебе, на новай аснове будуць прарастаць крывёю нашай эпохі.

Кузьма Чорны

Бацькаўшчына

(З п'есы)

Леапольд Гушка—прагнаны з двара парабак, патомак сілескіх ткачоў. Ён прагне купіць кавалачак свае зямлі. Але на гэта і грошай няма і нямае ён расійскага падданства, а бяз гэтага купляць зямлі ня мае права. Сурвіла, заможнік, купляе ў пана шмат зямлі і ўраздроб прадае тым, хто ня мае грошай. Яны яму выплачваюць і за процанты адробліваюць. Так Сурміла выростае ў вясковага туза. Адась Гушка—сын Леапольда Гушкі, рабочы з фабрыкі, якую выстраіў і пашырае пан, прадаючы маёнткі: адбываецца капіталізацыя вёскі. Адась у турме за рэвалюцыйную падпольную работу. Марылька—дачка Гушкі. Сурвіла—валасны старшыня. Адбываецца ў часы перад імпэрыялістычнаю вайною.

Хата Леапольда Гушкі. Пустыя сьцены, нізка навісла столь. Вясельле: Марылька ідзе замуж за Паўла Няміру. Вясельныя за сталом. У хату ўвайходзяць музыкі.

Леапольд Гушка (да музык)—Суседзі, добрыя людзі. Вы прышлі павесяліць нас. Дык падсядайце да стала, будзьце за сталом за гаспадароў.

(Музыкі падыходзяць да стала, выпіваюць па чарцы і садзяцца пасярод хаты на тапчан)

Леапольдава жонка—Госьцейкі, пеце і закусвайце чым бог даў.

Леапольд Гушка—Станем на ногі, на сваёй зямлі разжывемся, тады іншы пачастунак будзе... Сёньня ў мяне такі дзень: Марылька, дачушка ты мая! Павалка!..

Голас—За здароўе маладых!

Музыкі граюць

За сталом гаворка:

— Ты, суседзе, выплаціў ужо Сурвілу за зямлю?

— Дзе бачыў! Але мне ўжо мала асталося.

— А я можа яшчэ з дзесяціну прыкуплю, калі гэта зыплачу.

— Ярыну жняце?

— Пачалі.

— А чорт яго. Гэта-ж мне на гэтым тыдні трэба Сурвілу за процанты тры дні аджаць. Не разарвацца.

Леапольда жонка—Людзі некаторыя павыплачвалі, зямлю атрымалі, а мы дык... Калі нават і выплацім, дык падданства други год як ня прыходзіць. Ня відно й ня чутно, як у ваду.

Голас—Сурвіла клапоча перад канцэлярыяй пра падданства, дык можа ён наўмысьле, каб ты яму, Леапольдзе, папарабіў? Ён з прыставам свае людзі.

Другі голас—Ат, тут справа дзяржаўная.

Леапольдава жонка—Хто яго зведае. А пакуль што рабі. Каторую пору ўсе памагаем Сурвілу хутар забудоўваць.

Леапольд Гушка—Прыдзе падданства, быць ня можа. Гадоў паўгара прэйшло, гэта праўда. Паўтара гады гараваў больш як ніколі. Але за гэты час за дзесяціну ўжо зыплаціў. Асталася яшчэ дзесяціна. Дзьве дзесяціны будзе свае зямлі. (З ясным тварам паварочваецца да жонкі): Маці, чуеш? Сёньня ў мяне такі дзень! Марылька, Павалка! (Раптам хмурнее). (Цішэй-



шым голасам): Божа мой, божа, ласкавы.

Голас—за здароўе маладых!

Пауза.

Леапольдава жонка—Госьцейкі, намілае здароўе... Мае вы людцы добрыя.

Леапольд Гушка—Маці, што ты?

Леапольдава жонка—А Адась? А Адаська! У турме недзе гніе. Яму нават ня суджана на Марыльчыным вясельлі пагуляць.

Леапольд Гушка—Адась, мой сын! Ён за праўду. (Апускае галаву. Маўчыць).

Голас—Я чуў што Адася неўзабаве павінны выпусьціць.

Леапольд Гушка—Такі у мяне сеньня дзень!

Музыкі згралі. Уваходзіць чалавек з кіем. У парозе зьняў шапку.

Чалавек—Добры вечар у хату.

Леапольд Гушка—Добры вечар. Каго бог прынёс?

Чалавек—Я соцкі з воласьці.

Леапольд Гушка—А з чым бог прынёс? (устае з свайго месца).

Чалавек—Паперу з воласьці вам. (Цішэй) Ці не на вясельле я трапіў?

Леапольд Гушка бярэ цераз стол ад чалавека паперу, моўчкі разьбірае. Цішыня.

Леапольд Гушка (узьнятым голасам крычыць)—Падданства!!!

Агульнае ажыўленьне. Леапольд Гушка выходзіць з-за стала, шмат гасьцей падымаюцца таксама. Леапольд Гушка хапае за плечы чалавека з воласьці.

Леапольд Гушка—Садзіся, чалавеча, садзіся з намі за стол. Ты мне прынёс гэтакую навіну!.. Ты й сам ня ведаеш што ты мне прынёс! Маці, ты чуеш?!. Чалавеча, гуляй разам з намі!.. Я цяпер на гэтай зямлі гаспадар. (Музыкі граюць. Шумна, весела. Леапольд Гушка садзіць поплеч сябе соцкага. Усе за сталом. Шумнае ажыўленьне ўсё павялічваецца. Хтосьці моцна стукае ў дзьверы. Усе за сталом усталі).

Адась Гушка (на парозе)—Добры вечар.

Маці—Адась!

Леапольд Гушка—Адась!

(**Леапольд Гушка** разьметае рукамі ўсіх на сваёй дарозе. Кідаецца з-за стала да Адася).

Леапольд Гушка—Адася выпусьцілі Пачакай, пачакай, Адаська! Я цябе за стол так не пасаджу. Гэтакі дзень сёньня! Марылька замуж ідзе! Падданства прышло! Адась вярнуўся! Скінь з сябе, Адаська, гэтую нейкую арыштанскую вопратку. Адзень што лепшае. Гэтакі дзень! Гэтакі дзень! А што ты адзенеш? (Кароткая пауза) Ну адзень гэта...

(Скідае з сябе пільчак, усьцягвае на Адасёвыя плечы. Маці абнімае Адася).

Маці (плачучы)—Усю адзежу папрадалі на гэтую зямлю.

Адась—Аставайся, бацька, у сваім пільчаку. Я астануся так. (Акідае вокам усіх. Тут усё свае людзі. Усіх пазнаю.

Галасы—Што тут казаць. Свае людзі.

(Адась абнімае за шыю бацьку, трасе яго руку. Адась падыходзіць да Марылькі і Паўла. Вітаюцца).

Адась—Дык я на тваё вясельле трапіў, Марылька?

Леапольд Гушка—Гэтакі дзень! Гэтакі дзень!

(Усе зноў ужо за сталом. Адась сядзіць поплеч бацькі).

Маці—Цябе-ж, сын мой, зусім пусьцілі? Ты-ж з намі будзеш цяпер? Нікуды ты ад нас ня пойдзеш!

Леапольд Гушка—Ты прышоў. А за хвіліну можа да цябе, прышло падданства. Ты цяпер будзеш дома, Адаська, на сваёй зямлі будзем. За зямлю разам выплацім. Усе тут пакрысе выплачваюць.

Адась—Зямля вам будзе без ніякіх выплатак. Вы на ёй робіце.

Голас—Хіба чуваць што?

Другі голас—Ты чуў там, паміж людзей? Дзевяцьсот пяты год хіба зернецца?

Леапольд Гушка—Я заўсёды спадзяваўся. Я не сядзеў рукі склаўшы. Я варушыўся на сьвеце, тупаў, стараўся, рабіў. (Устае з чаркаю ў руцэ) Гэтага дня я доўга чакаў! Усё жыцьцё сваё я яго чакаў! Агульнае ажыўленьне. Гэтакі дзень! Гэтакі момант! (Засьпяваў, з чаркаю ў руцэ:)

Дай-жа божа добры час,
Як у людзей так і ў нас.
І добрую гадзіну—
Разьвяселім радзіму.

(Усе падхапілі хорам, пад акампанімэнт музык. Прасьпявалі два разы. За сцэнай раптам шум, галасы, гармідар. Хтосьці закрычаў, хтосьці заплакаў. Частка гасьцей кідаецца да вокан. Леапольд Гушка стаіць з чаркаю ў руцэ).

Галасы на двары:

— Божа мой, што гэта будзе!

— Цяпер-жа й майму сыну прыдзецца йсьці.

— Усе пойдуць!

Госьці ў хаце:

— Што там?

— Хто там крычыць?

(Усе кідаюцца да дзьвярэй. У адчыненых дзьверах рухавы натоўп.)

Голас (заглушае ўсё)—Вайна! Заўтра ўсім у салдаты йсьці трэба!

(Павал Няміра йдзе з-за стала. Марылька за ім).

Маці (стаіць як аслупянелая)—У які дзень Марылька замуж пашла! Паўлу-ж ісьці трэба! (Хапаецца раптам за галаву) І Адасю!!

Леапольд Гушка—Я ня тутэйшы падданы. Адась ня пойдзе ваяваць за чужыну.

Маці—Ужо-ж падданыя!

(Кідаецца з хаты).

Леапольд Гушка (адзін. Чарка валіцца з ягоных рук)—Зямля! Падданства! Адась з турмы! Марылька замуж! За якую заяваць бацькаўшчыну? Зямлі тутэйшае я яшчэ не каштаваў! Ня трэба мне гэтае зямлі! Гэтакае зямлі!

(Як аслупянелы. Паволі гасьне сьветло).

2

Пляц у гарадку перад ратушаю (сярэдневяковы будынак, канцэлярыя гарадзкога прыстава. (Над уваходам выстаўлены сьцяг Расійскай імпэрыі. Перад ратушаю народ: сяляне, рабочыя, гарадзкія рамесьнікі. Старыя маладыя; жанчыны з дзецьмі на руках. На ганку перад народам прыстаў; Сурвіла (валасны старшыня), поп у аблачэньні, з крыжам у руках).

Прыстаў цяпер, у мінуту мабілізацыі, мы ўсе как адзін должны помніць вялікую для Расіі гадзіну: Паказаць перад врагом незыблемасьць нашага ацечаства. За веру, цара і ацечаства, ура!

(Некалькі галасоў з натоўпу гукнула «ура».).

Поп (благаслаўляе крыжам народ)—Сегодня все, не только мы, рускіе, а і все іноверцы, населяющіе великое наше рускае отечество, должны пронікнуцца єдіным духом патриотизма. Да укрэпіт вас бог в борбе за победу.

Прыстаў— Ура!

(У натоўпе крычаць «ура». Галасы ў натоўпе).

— Ня зернешся дадому. Пасіраціцца дзеці.

— Глядзі дзяцей. Дзе яны, дзеці мае?

— Пасіраціцца. Але на тое вайна.

— У два месяцы саб'ем нямчуру.

— Нікога я не хачу біць!

(На ганку засьпявалі «боже царя храни». Леапольд Гушка паволі ідзе да прыстава).

Леапольд Гушка (да прыстава)—Не хачу я падданства. Ня трэба мне й зямлі гэтае! Можа я быў-бы шчасьлівейшы, каб я трымаўся бацькаўшчыны ня гэтае. Каб я вярнуўся ў сваю Сілезію. Можа-б бацькаўшчына тая была мне ласкавейшая... [1])

Прыстаў—Гушка!

Леапольд Гушка—Але.

Прыстаў—Але, але! В такой дзень ня можаш сказаць рускім языком.

Леапольд Гушка—У такі дзень! У такі дзень мне трэба яшчэ пасьпець папарабіць на Сурвілавым полі! От што ў такі дзень!

(Стаіць на фоне натоўпу, сьціснуўшы кулакі).

---

[1]) П'еса да 15-й гадавіны Кастрычніка, Першаму Беларускаму Дзярж. Тэатру.

[1]) Так як вайна разьбівае ў Леапольда Гушкі ілюзію на шчасьце ад уласнасьці (зямля), так у другім акце гэтае п'есы, дзе вайна і рэвалюцыя, буржуазнае уяўленьне нейкае «ласкавейшае», ня гэтае (радзіма бацькоў) бацькаўшчыны, у Леапольда Гушкі разьбівае сілезец Эдвард Лявэр, рабочы з капальняў, які падаецца ў палон, бо яму няма чаго ваяваць якраз за тую самую Сілезію (нямецкую вобласьць).

ТРЭЦЯМУ ПАКАЛЕНЬНЮ—КОМУНІСТЫЧНУЮ КНІГУ

У дзень дзесяцігодзьдзя піонэрорганізацыі савецкія пісьменьнікі павінны мобілізавацца на выкананьне задач па стварэньню бальшавіцкай дзіцячай літаратуры

Аб стане дзіцячай дашкольнай літаратуры

У час агляду дзіцячай літаратуры нельга абыйсьці моўчкі пытаньне аб стане дзіцячай літаратуры для дашкольнікаў, бо гэта найбольш закінутая галіна дзіцячай літаратуры.

Значэньне дашкольнай кнігі, у сувязі з пашырэньнем грамадзкіх інтарэсаў нашай дзетвары, значна ўскладняецца. Праз кнігу дзіця сыстэматызуе і ўдасканальваньне той шырокі і рознастойны вопыт, які дае сучасная рэчаіснасьць. Таму дашкольная кніга павінна багата і рознастайна паказваць дзецям усе галіны новага жыцьця.

Пагледзім, што можа знайсьці пэдагог-дашкольнік або бацька для дзіцяці на кніжным рынку. Уся продукцыя Д.В.Б. за 30-31-32 гг у галіне дашкольнай кнігі недапушчальна абмежаваная: 3 кніжкі А. Александровіча, 2 кніжкі Чарняўскай, 1 кніжка Каганоўскай, 2 кніжкі Ладнага, 1 кніга Дылы і 5—6 перакладных з рускай мовы—вось і ўсё.

Разглядзім якасьць гэтых кніжак у адпаведнасьці з нашымі запатрабаваньнямі. Кнігі грамадзка-палітычнага зьместу для дашкольніка амаль што няма. Вось адзінкі; А Александровіча «Як дзеці будавалі самалёт». Т. Чарняўскай «Андрэйка», у якой адбіты эпізод з жыцьця грамадзянскай вайны з белапалякамі, удзел партызан у гэтай вайне і дапамога невялікага хлопчыка Андрэйкі партызанам. У апавяданьні добра натуральна, бяз крыклівай паказнасьці ўведзены моманты героізму, як усіх партызан, так і хлопчыка.

Апавяданьне напісана жывой даступнай дзецям мовай. Галоўным недахопам у апавяданьні зьяўляецца недастатковы паказ клясавага расслаеньня вёскі. Толькі ў некаторых мясцох аўтар закранае і то мімаходам гэта пытаньне.

Ёсьць добрая кніжка, пераклад з рускай мовы, «Красін у Ледавітым полі» Вярэйскай. «Таня рэволюцыянэрка» і ўсё. Ні кніжкі пра Чырвоную армію, ні кніжкі,якая-б малявала жыцьцё дзяцей у буржуазных краінах, ні на антырэлігійную тэму, ні ўвязанай з днямі чырвонага календару. А паказ нашага сацыялістычнага будаўніцтва? Адна кніга «Днепрабуд» і тая цяжкая для дашкольніка. Між тым, у рускай дзіцячай літаратуры мы маем нядрэнныя ўзоры ў галіне дашкольнай кнігі на гэтыя тэмы.

Тое-ж самае і з кнігай політэхнічнага характару. Пачын т. Александровіча кніжкай « Як цацкі дома рабіць самому», выдавецтва не працягвае і не пашырае. Добры твор Якімовіча «Сэрца гораду», у якім паказана значэньне электрастанцыі для ўсіх галін вытворчасьці і жыцьця гораду. Твор зьмешчаны ў часопісу «Іскры Ільліча» і да тэтай пары выдавецтва не паклапацілася выдаць яго, добра ілюстраваўшы, асобнай кніжкай. Маем яшчэ кніжку Громава «Гульні з вятрамі», у якой паказана, як зрабіць некаторыя папяровыя цацкі.

Астанія тэмы, як наша вытворчасьць, дасягненьні тэхнікі, паказ некаторых даступных процэсаў, не датычыцца нашых дзяцей.

Праўда, вось гэтымі днямі вышла кніжка т. Каганоўскай «Як Натка гутарыла з маткай». Добрая кніжонка. Тут т. Каганоўская дала ўдалы малюнак у вершаванай форме аб тым, як дзяўчынка выкарыстала тэлефон, радыё і тэлеграф, каб пагаварыць з маткай, якая то на працы, то на сходзе, то ў камандыроўцы. Тав. Каганоўская бярэ на фоне багатага сучаснага жыцьця інтарэсы дзіцяці і ўдала ўвязвае гэтыя моманты. Трэба зазначыць, што пэдагогі і дзеці пазнаёміліся з т. Каганоўскай яшчэ да гэтай кніжкі па даволі частых выступленьнях у часопісе «Іскры Ільліча». Каганоўская ведае сучаснае дзіця ў колектыве, ведае працу дзіцячых устаноў і тэматыка яе рознастайная, жывая, эмоцыянальная. Але ёй яшчэ шмат трэба працаваць над мовай.

Вершы яе пакуль што яшчэ прымітыўныя, тэмы распрацаваны схематычна, у іх маецца ўсё што трэба, але не распрацавана і таму часта неперакапальна для дашкольніка. У значнай частцы апавяданьняў гола выпірае мораль, што ствараe некаторую фальш, так, напрыклад, апавяданьне «Ленінцы» («Іскры Ільліча», № 1, 1932 г.), «Сустрэча» («І. І., № 3, 1932 г.) і інш.

Лепш удалася Каганоўскай работа «Ударныя брыгады» («І. І.») і зусім ня дрэнна апошняя кніга «Як Натка гутарыла з маткай».

Прыродазнаўчая кніга мае лепшы лёс, лепш сказаць, яе зусім няма для дашкольнікаў. Праўда, мы маем тое дасягненьне, што за апошнія 2—3 гады ня друкуюцца кнігі нерэальнага зьместу: кацачкі-цацачкі, казюлечкі ды Дзеды Марозы перасталі турбаваць дзіцячую аўдыторыю. Хоць позна, але маем такія дасягненьні. Але за тое Выдавецтва зусім закінула гэту галіну дзіцячай кнігі. Маем кнігу Штам «А чараякі лётаюць» (пераклад, якая дае добрае ў даступнай дзяцям форме тлумачэньне пераходу мятліка з аднэй формы у другую. Але і гэта кніга не пазбаўлена памылак ранейшых выданьняў. Тут і верабейчык з чарвячком вядуць вельмі цікавую гутарку, тут і вусень ведае, што з яго атрымаецца, калі ён ужо ня будзе вусенем, тут і чалавек ведае, што з ім станецца, калі ён высахне на сонцы і таму «ня любіць» выглядаць на паверхню зямлі.

Такая тэолёгічная ўстаноўка на прыроду шкодная для нашых дзяцей. Дапусьціўшы такога парадку мэтодолёгічныя памылкі, мы зьнішчаем усякую вартасьць прыродазнаўчай кнігі. Ня многа лепш справа абстаіць з кнігай Біянкі «Вайна ў лесе» (пераклад), якая дае ўяўленьне аб барацьбе за існаваньне сярод лясных парод, прыфарбаваўшы гэту барацьбу момантам сьвядомага імкненьня да змаганьня.

Цікавая спроба т. Чарняўскай даць у артыкуле «Шалёны сабака» (кніжка «Лявонка») сутнасьці супроць інфэкцыйных прычэпак. Каб апавяданьне было выдана асобнай кніжкай і багата ілюстравана, яно зьявілася-б добрым цікавым матэрыялам. У кніжцы «Лявонка» яно губляецца.

Вось і закончан агляд прыродазнаўчай кніжкі. Больш ні пачытаць, ні паказваць дзецям з праяў прыроды няма чаго. А ў жыцьці дзяцей-дашкалят і рабоце дашкольных устаноў прырода займае вельмі пачэснае месца.

Пераважная большасьць кніжак, якая выдана Д. В. Б. за апошні час, гэта кнігі, якія малююць наш быт. Тут у першую чаргу трэба адзначыць т. Александровіча, які даў для самых маленькіх дзяцей удалыя бытавыя малюнкі: «Калыханка», «Хлопчык і пеўнік», «Горад раніцай» (нажаль, дужа сапсуты ілюстрацыі). т. Александровічу варта ўдзяліць больш увагі і адвесьці час для дзіцячай кнігі. На сёнешні дзень «Горад раніцай» ужо ўстарэла і таму трэба паклапаціцца аб новым матэрыяле.

Тав. Чарняўская дала некалькі апавяданьняў у зборнічку «Лявонка», якія заслугоўваюць увагі, каб разгледзіць іх кожны паасобку. У тав. Чарняўскай вельмі ўдалася мова. Адчуваецца глыбокае веданьне дзіцячага жыцьця і перажываньняў, але ранейшага дзіцяці, і таму з тэматыкаю справа ў т. Чарняўскай абстаіць слаба. Трэба больш вывучыць быт і інтарэсы сучаснай дзетвары, іхнае жыцьцё ў колектыве, іхнія перажываньні. А то атрымоўваецца, што здольная пасутнасьці даць добрую дзіцячую кніжку (аб гэтым сьведчыць апавяданьне «Андрэйка») у многіх апавяданьнях т. Чарняўская мэты не дасягае.

Возьмем для прыкладу апавяданьне «Лявонка». Дібра абмалёваны бытавы бок—пачатак, а далей якасьць твору зьніжаецца, даводзіцца да протакаліраваньня падзей, а не мастацкага паказу, атрымалася нудна. Хоць трэба адзначыць дадатны бок, што тав. Чарняўская ў гэтым апавяданьні ўзялася за распрацоўку новай тэмы.

Зусім адсутнічае ў дашкольнай літаратуры вясёлая дзіцячая кніга-жарт, гэты прабел трэба было-б нашым мастакам слова запоўніць як мага хутчэй. Нам няма чаго даць дзецям, каб выклікаць здаровы бадзёры сьмех ад разумнай выдумкі.

Малюнак у кніжцы для дашкольніка дапаўняе, тлумачыць тэкст, а ў некаторых выпадках і замяняе яго.

Возьмём напрыклад. Як ілюстравана кніжка Александровіча «Калыханка» (малюнкі мастака Малкіна)? Добрыя словы, добрае выданьне (на кароне ў выглядзе шырмы) зусім сапсута ілюстрацыяй. Кот—чырвоныя з чорнымі плямамі, птушкі чырвоныя і ўсё гэта пададзена нясуразнымі штрыхамі. Дзеці толькі дзівяцца натакія малюнкі. А выкананы яны ў чатырох фарбах і мастак меў магчымасьць разгарнуцца. Лепш крыху ўдалася ілюстрацыя «Хлопчык і певень», затое «Горад раніцай» уяўляе сабой грубы набор рэзкай сумясі яркіх фарбаў.

Другі прыклад кніжка т. Дыла «Вясна» (малюнкі Дзясьніцкага). Па сутнасьці там тэксту няма, а толькі подпісы пад малюнкамі. Тут ілюстрацыя павінна была мець пераважнае значэньне і замест гэтага мы маем нейкія намёкі на малюнак, ці то падражаньню дзіцячаму малюнку— цяжка сказаць; толькі мы тут знаходзім выкручаныя ногі, як ў дзяцей так і жывёлы. Сонца з трох крыжыкаў белага, чорнага і блакітнага. Нават дзеці так не малююць. А як трымаецца той хлапец, што сьнег са страхі зьмятае?

І нарэшце аб аўтарах. Для дзяцей малодшага ўзросту мала пішуць нашы пісьменьнікі і недастаткова прыцягваюць пэдагогаў да гэтай справы.

А. С. і Е. Г.



Пра стварэньне оргкомітэту адзінага саюзу савецкіх пісьменьнікаў

У апошні, завяршальны год першай пяцігодкі, на парозе другой пяцігодкі, перад усёй савецкай пісьменьніцкай грамадзкасьцю стаіць задача най большай мобілізацыі сіл пісьменьнікаў для творчага ўдзелу ў вялікім будаўніцтве, якім кіруе комуністычная партыя. У Саюзе Савецкіх Рэспублік узрасла і разьвіваецца далей цьвітучая літаратура. Рабочыя і колгасьнікі, загартаваныя ў рэволюцыйнай барацьбе, што праходзяць школы ленінскай культурнай рэволюцыі, вылучылі са сваіх шэрагаў новыя кадры пісьменьнікаў, якія ўжо стварылі выдатныя мастацкія творы. Значная і лепшая частка пісьменьнікаў з асяродзьдзя інтэлігенцыі зразумела вялікую праваТу і сусьветна-вызваленчае значэньне справы рабочае клясы, гегемона ўсіх працоўных у барацьбе за зьнішчэньне самой магчымасьці эксплёатацыі чалавека чалавекам, і ўступіла на шлях актыўнага падтрыманьня політыкі савецкай улады.

Пастанова Цэнтральнага Комітэту ЎсеКП(б) пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый стварае най больш спрыяльныя ўмовы для творчай работы ўсіх пісьменьнікаў, «якія падтрымліваюць пляцформу савецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве».

Расійская Асоцыяцыя Пролетарскіх Пісьменьнікаў (РАПП), створаная ў першыя гады НЭП'у для ўмацаваньня позыцый пролетарскай літаратуры ў абставінах, калі былі яшчэ моцнымі ўплывы варожых элемэнтаў у літаратуры на даным этапе выявіла ў сваёй дзейнасьці небясьпеку групавой замкнутасьці, адрыву ад політычных задач сучаснасьці і самаізоляцыі ад лепшай часткі пісьменьнікаў, што павярнулі ў сваёй ідэёва-творчай рабоце ў бок пролетарыяту.

Пастанова ЦК палягчае ўсім пісьменьнікам магчымасьць, пераможшы вузкія групавыя інтарэсы і звычкі, з усёй энэргіяй накіраваць свае творчыя намаганьні на ўдзел, пры дапамозе сродкаў мастацтва, у пераможнай барацьбе пролетарыяту за ператтварэньне ўсіх працоўных у актыўных і сьвядомых будаўнікоў соцыялізму.

Літаратурныя організацыі РСФСР заклікаюць усіх савецкіх пісьменьнікаў з'яднацца разам з іншымі працоўнымі навокал комуністычнай партыі, кіруемай ленінскім цэнтральным комітэтам.

Літаратурныя організацыі РСФСР пастанаўляюць для ажыцьцяўленьня пастановы ЦК пра стварэньне адзінага саюзу савецкіх пісьменьнікаў склікаць пазачарговы зьезд савецкіх пісьменьнікаў.

Для кіраўніцтва існуючымі літорганізацыямі, падрыхтоўкі і правядзеньня зьезду стварыць Організацыйны Комітэт у наступным складзе:

М. Горкі—ганаровы старшыня
Гронскі—старшыня
Кірпоцін—сакратар
Асееў
Афанагенаў
Бахмецьцеў
Бязыменскі
Беразоўскі
Біль-Белацэркоўскі
Жыга
Замойскі
Ус. Іванаў
Кіршон
Леонаў
Малышкін
Паўленка
Панфёраў
Сейфуліна
Слонімскі
Серафімовіч
Стаўскі
Ціханаў
Фадзееў
Федзін
Чумандрын.

ПАДПІСАЛІ

По даручэньню ВССП:
Леонаў, Паўленка, Малышкін, Огнеў, Ўс. Іванаў, Лідзін, Інбэр, Сейфуліна.

Па даручэньню РАПП:
Аўэрбах, Кіршон, Фадзееў, Бязыменскі, Серафімовіч, Панфёраў, Стаўскі, Гладкоў, Б. Ілеш, Шолахаў.

Па даручэньню РАПКП:
Є. Пад'ячаў, Дземідаў, Замойскі, Дарагойчанка, Шухаў, Перміцін, Ів. Макараў, Батрак, Семёнаў.

Па даручэньню ЛАЧАФ:
Дзехцяроў, Новікаў-Прыбой, І. Сельвінскі, Лугаўской.

Па даручэньню «ПЕРАВАЛА»:
Ів. Катаеў, Губэр, Зарудзін.

Адказны рэдактар Х. ДУНЕЦ

Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

А. Якімовіч

Некаторыя пытаньні дзіцячай літаратуры

1. Задачы дзіцячай літаратуры

ЦК Комуністычнай партыі ў сваёй гістарычнай пастанове аб «Пачатковай і сярэдняй школе» вызначыў асноўныя задачы комуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня.

Такія задачы па лініі «падрыхтоўкі ўсебакова разьвітых членаў комуністычнай грамады» стаяць і перад ўсімі паасобнымі зьвеньнямі, што выхоўваюць наша маладое ленінскае пакаленьне. Яны цалкам і поўнасьцю адносяцца і да дзіцячай літаратуры, як аднаго з магутных фактараў шырокага пэдагагічнага процэсу.

Літаратуры, як зброі клясавага змаганьня, належыць вялізарная роля ў выхаваньні «пакаленьня, здольнага канчаткова ўстанавіць комунізм».

«У пэрыод соцыялізму, калі пролетарыят ажыцьцяўляе канчатковае зьнішчэньне клясаў, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, выключна важнае значэньне набывае вытрыманае комуністычнае выхаваньне ў савецкай школе і ўмацненьне барацьбы супроць усякіх спробаў прышчапіць дзецям савецкай школы элемэнты антыпролетарскай ідэолёгіі» (з пастановы ЦК).

Выкананьне гэтай вялізарнай задачы патрабуе ад усіх зьвеньня ў фактараў комуністычнага выхаваньня асаблівай увагі і пільнасьці.

Якая-ж літаратура для дзяцей нам патрэбна зараз?

Гэтыя пытаньні вырашае ЦК партыі ў сваёй пастанове па дакладу выдавецтва «Молодая гвардия».

Нам патрэбна стварыць дзіцячую кнігу «бальшавіцкі - бадзёрую, заклікаючую на змаганьне і перамогу. У яркіх і вобразных формах дзіцячая кніга павінна паказаць соцыялістычную пераробку краіны і людзей і выхоўваць дзяцей у духу пролетрскага інтэрнацыяналізму. Карэнным чынам палепшыць якасьць афармленьня дзіцячай кнігі і ілюстрацыі, сочачы за тым, каб яны ня прыводзілі да скажэньня політычнага сэнсу кнігі і скажэньню задач мастацкага выхаваньня дзяцей».

Як-жа наша беларуская дзіцячая літаратура справілася і спраўляецца з гэтымі задачамі?

Вось асноўнае пытаньне, якое ставіць зараз перад намі агляд дзіцячай літаратуры БССР, распачаты па ініцыятыве піонэрскіх газэт і часопісі.

Становішча дзіцячай літаратуры на сёньняшні дзень прымушае нас біць трывогу: з гэтымі задачамі мы ня справіліся.

Мы ўжо маем сотні выдадзеных кніжак — перакладных і орыгінальных. Але з гэтых соцен нельга назваць нават дзесятка такіх, якія нам зараз пільна патрэбны.

2. Дзе-ж орыгінальная кніжка?

На сёньняшні дзень ні выдавецтва, ні, тым больш, пісьменьнікі ня могуць пахваліцца сваімі посьпехамі ў гэтай адказнай і пільна патрэбнай рабоце.

Некалькі такіх орыгінальных кніжак пра наша сёньня мы, пакапаўшыся, можам знайсьці ў плянах выдавецтва, частку—у друкарнях. Дзе хочаце, але не ў бібліятэках і ня ў кніжных магазынах.

Такая кніжка ўсё яшчэ друкуецца... Яна нават пішацца, аб чым сьведчаць заявы і абяцаньні многіх пісьменьнікаў, дадзеных імі піанэрам і ўсім дзецям праз газэту «Піонэр Беларусі».

Зараз мы маем пару дзесяткаў выдадзеных за ўвесь час орыгінальных кніжак. Гэта кніжкі: **Маўра, Александровіча, Барашкі, Сташэўскага, Чарняўскай, Баранавых, Каганоўскай, Ладнага, Волкавай** і інш. аўтароў. З гэтых пералічаных аўтароў стала працуюць над стварэньнем дзіцячай літаратуры толькі некаторыя. Кніжка **Барашкі «Асінстан»** (выданьне «ЛІМ») трапіла ў катэгорыю дзіцячых чыста выпадкова.

«Асінстан» Барашкі цікавы, мне здаецца, толькі формаю кампаноўкі матар'ялу, праўдзівей, шуканьнем новай формы. Зьмест кніжкі ўсё-ж даволі слабы і далёка не паказвае нашым дзецям усяго таго значэньня, якое мае для Савецкай Беларусі Асінстан.

У кніжку «Асінстан», якая мае монтажную структуру, уведзены, калі меркаваць па некаторых рыфмах і спосабу разьбіўкі, вершы. Яны займаюць пераважнае месца. Але вышлі ні вершы, ні проза.

Вось лепшыя з вершаў:

«Дзе ўчора быў спакой, імгла,
Сягоньня вырас Сталінстан!
Гучней трубі, прызыўная труба,
Нам: пабудаваны Асінстан!

Часта Барашка за мест вабразнасьці дае пародыю на вабразнасьць.

«Сэрца ў грудзёх—
Гудзіць матор...»

Вітаючы добрыя пачынаньні аўтара ў шуканьні новых формаў, нельга ўсё-ж не зьвярнуць увагі на допушчаныя ім зрывы, што значна зьніжае мастацкую якасьць патрэбнай нам пра Асінстан кніжкі.

Якія мы маем на сёньня яшчэ кніжкі аб соцыялістычным будаўніцтве?

Такіх можна назваць тры—чатыры. 1—усё. Сярод іх варта адзначыць кніжку **«Гомсельмаш» — І. Волкавай.**

Але гэта кніжка ня можа быць аднесена да мастацкай літаратуры. Просты звычайны сухі газэтны артыкул аб тым, што і як вырабляе Гомсельмаш. Нарысам назваць гэты артыкул таксама нельга. Аўтар, сабраўшы багаты матар'ял, ня здолеў яго добра аформіць. **А форма падачы матар'ялу для дзяцей мае выключна важнае значэньне.** У гэтых адносінах кніжка **В. Сташэўскага «Гаворыць Асінстан»** па форме падачы і апрацоўкі фактычнага матар'ялу заслугоўвае ўвагі, хоць гэтая кніжка напісана і не для дзяцей.

Кніжкі найбольш папулярнага сярод дзіцячага чытача аўтара, Я. Маўра, на жаль, амаль усе «прыгодніча-юць» там, дзесьці далёка ад нас... Маўр для першых сваіх кніжак шукаў матар'ялаў і прыгодаў у акіянах, на Вогненнай зямлі, у краіне райскай птушкі, у мінулым чалавецкай гісторыі. нават... у «пекле».

Праўда, новая кніжка Маўра — **«Аповесьць будучых дзён»**—ёсьць у гэтых адносінах шаг, і значны шаг, наперад. Гэтая кніжка яшчэ друкуецца, хоць напісана яна каля трох гадоў таму назад.

У першых сваіх кніжках Маўр ставіў задачу пазнаёміць чытача з невядомымі яму людзьмі і краінамі, даць чытачу кніжку на гэтыя тэмы з новым сацыяльна - насычаным зьместам. Аднак, прыгодніцтва, як форма кніжак, часта засланяе перад аўтарам гэтыя асноўныя задачы, становіцца самамэтай. Асабліва гэта выявілася ў кніжцы **«Сын вады».** Што астаецца ў памяці пасьля чытаньня гэтай найпрыгодніцкай кніжкі? Бязумоўна, прыгоды дзікуна, фуіджынца Манга, з «Белай птушкай»—лэдзі Грэт. Бедны фуіджынец увесь час ратуе лэдзі, якая трапіла на выспу з разьбітага карабля. І вось, ня гледзячы на ўсе пакуты для беднага Манга, ён усё-ж выканаў свой абавязак: выратаваў дачку ангельскага фабрыканта-колоніста.

Не выратоўвае аповесьці і «прышыты» канец. Дзікун Манг едзе з лэдзі Грэт у Лёндан, дзе добрая міласьцівая міс падшукве для яго работу ў рэсторане, плаціць гаспадару за яго навучаньне, каб гэтым аддзякаваць за паратунак ад сьмерці. Але Манг не дагадзіў гаспадару, і апынуўся на вуліцы, як беспрацоўны. І гэта не ў аповесьці, а ў заключэньні, агульнымі словамі...

У гэтых адносінах кніжкі «Ў краіне райскай птушкі» і «Амок» у асноўным маюць куды большую сацыяльную важнасьць, асабліва **«Амок»,** дзе аўтар сацыяльным проблемам, клясавай барацьбе прыгнечаных колёніяльных народаў адводзіць першае месца, адначасова знаёмячы чытача з прыродай, бытам і жыцьцё невядомых яму краін і людзей, Гэтая кніжка ў асноўным выкарыстоўвае фактычны матар'ял з рэвалюцыйнай барацьбы прыгнечаных колёніяльных народаў.

Маўру патрэба больш сур'ёзна думаць над тэматыкай свайго жанру. Гэты жанр адзін з прывабных для дзяцей. Такія кніжкі чытаюцца нарасхват. Тым больш да іх павінны быць запатрабаваньні.

Маўр добра робіць, калі ў апошняй сваёй кніжцы «Аповесьць будучых дзён» спрабуе паказаць нашу будучыню пры пабудове соцыялізму ў СССР і будучыню Заходняй Беларусі, заняволенай польскім фашызмам.

Аднак, і наша сучаснасьць і тэрыторыя СССР могуць даць для пісьменьніка многа матар'ялу, які будзе мець куды большую сацыяльную вартасьць і дасьць большую карысьць для чытача.

Гэтым, зразумела, я не выступаю супроць кніжак з жыцьця розных людзей і краін. Такія кніжкі, напісаныя ў «духу пролетарскага інтэрнацыяналізму», нам вельмі патрэбны. Але ня менш, а зараз нават больш, патрэбны нам кніжкі для дзяцей пра наша жыцьцё, пра нашу краіну.

Маўр можа і павінен паказаць нашым дзецям, як адсталыя дзікунскія і поўдзікунскія пляменьні і народы былой царскай Расіі становяцца ва ўмовах савецкага ладу, культурнымі людзьмі, актыўнымі будаўнікамі соцыялізму.

Для апавяданьняў **С. Баранавых,** сабраных у зборніку **«Злосьць»,** характэрна пэўная аполітычнасьць. Такія апавяданьні, нядрэнна напісаныя як мастацкія творы, нічым не выдаюць сябе, як творы пра нашых савецкіх дзяцей, пра наш час. Гэта — капаньне ў псыхолёгіі хлапчука - героя. Хто-ж гэты герой? Для аўтара няважна. Аўтар паставіў перад сабою скромную задачу — паказаць псыхолёгію злосьці ў нейкага Сенькі. І толькі. Такія проблемы менш за ўсё хвалююць нашага сучаснага дзіцячага чытача.

Кніжкі С. Баранавых з агульнай літаратуры даводзяць нам аб тым, што аўтар, як дзіцячы пісьменьнік проста не зразумеў. сваёй задачы. Ад яго дзіцячая літаратура чакае такіх твораў, як «Межы», «Два канцы» і інш. і Баранавых павінен выправіць недахопы сваёй першай дзіцячай кніжкі— даць нашым дзецям новыя высокамастацкія і ідэолёгічна вытрыманыя апавяданьні пра наш час.

Некаторыя апавяданьні здольнай дзіцячай пісьменьніцы **Л. Чарняўскай** таксама «хварэюць» аполітычнасьцю. Характарным з іх зьяўляецца апавяданьні «Казёл Мэка і Кудла»—шчыра расказаная прыгода казла Мэкі і сабакі Кудлы на папоўскім банкеце. Каму гэта патрэбна? Тым больш, што такая прыгода — цэнтральны «вобраз» апавяданьня. Ніякай соцыяльнай вартасьці такія апавяданьні ня маюць і ня могуць мець.

У № 2 часопісі «Чырвоная Беларусь» надрукавана апавяданьне **М. Зарэцкага — «Петрык і Пятрусь».** Зьместам гэтае апавяданьне падыходзіць для старэйшых дзяцей. Тым больш, вялікая ўвага ў ім адводзіцца дзецям, хоць гэта, зразумела, не абавязкова. Значыцца, прыходзіцца вітаць тав. Зарэцкага — ён практычна ўключаецца ў дзіцячую літаратуру, хоць, як відаць, і ня меў тэтага на ўвазе...

Але мэтод тав. Зарэцкага, дасканала выяўлены ў яго «Фрагмэнтах», знайшоў сваё месца і тут. І тут увагу пісьменьніка прыцягвае толькі сямейная соцыяльная драма, як рэзультат колгаснага будаўніцтва, праўда, драма, па сутнасьці, фантастычная, і сапраўды. Сын аднаасобніка Пятруся, Петрык, «сьвядомы барацьбіт», ловіць уночы свайго бацьку і вартаўніка ў колгасным садзе на месцы праступленьня. Бацька траха не на сьмерць забівае маленькага Петрыка — чым ня сужэт для авантурнага жанру?

Такі «геройскі» ўчынак малыша мастацкі не апраўданы. Ад тав. Зарэцкага, як старэйшага кваліфікаванага пісьменьніка, мы павінны патрабаваць куды больш вытрыманых твораў пра нашых дзяцей і для дзяцей.

Падобных прыкладаў можна было-б прыводзіць і больш. Але і гэтыя прыклады з практыкі адзначаных старэйшых пісьменьнікаў гавораць аб тым, што наша орыгінальная кніжка яшчэ далёка не на належнай вышыні як з боку ідэолёгічнага, так і мастацкага.

Таму наш абавязак у час агляду дзіцячай літаратуры асаблівую ўвагу зьвярнуць на стварэньне орыгінальнай дзіцячай кніжкі, вартай нашай вялікай эпохі і нашых дзяцей.

Вельмі пагражаючае становішча мы маем з літаратурай для меншых дзяцей — дашкольнікаў і «О» груп. За апошнія гады кніжкі для дашкольнікаў — выпадковыя госьці. Тыя кніжкі, якія надрукаваны, зусім слабыя як мастацкія творы (кніжкі Ладнага, Каганоўскай). з дзесятак кніжак для дашкольнікаў, даўно падрыхтаваных да друку, чакаюць лепшай паперы. Аб гэтым, зразумела, ніхто не клапоціцца. Калі будзе добрая папера — невядома. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб дзейнасьці ДВБ зьвярнуў на неабходнасьць:

«Палепшыць і пашырыць выданьне дзіцячай (асабліва дашкольнай і юнацкай) літаратуры. ЦК ЛКСМБ забясьпечыць сыстэматычны ўдзел у гэтай працы». («Зьвязда» за 11 кастрычніка 1931 г.).

ЦК партыі абавязаў адпаведныя органы забясьпечыць **«паперай высокіх гатункаў»** дзіцячую літаратуру.

Гэтая пастанова ЦК партыі ня выканана. А ў выніку—за мінулы і гэты год выдадзена поўдзесятка нізкай якасьці кніжак для дашкольнікаў.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што мы яшчэ вельмі мала ўвагі аддаем дзіцячай літаратуры.

3. Палепшыць якасьць перакладаў

Гісторыя з перакладной кніжкай М. Ільліна характэрна і для многіх кніжак. Перакладных кніжак у нашай дзіцячай літаратуры пакуль-што пераважная большасьць. Яны звычайна выходзяць з друку ў нас са спазьненьнем на гадоў тры, а то і пяць пасьля напісаньня. І зразумела часта трацяць сваю актуальнасьць на сёньняшні дзень. Да гэтага трэба дадаць, што кніжкі для перакладаў падбіраліся выпадкова, ніхто над гэтым сур'ёзна не працаваў. Некаторыя з іх ня толькі «устарэлі», а проста зьяўляюцца шкоднымі.

Не разглядаючы зьместу і вартасьці перакладных кніжак у гэтым артыкуле, я хачу спыніцца на перакладах толькі з тэхнічнага боку.

Мы, апрача ўсяго, вельмі часта псуем кніжкі, нават і добрыя, недарэчнымі перакладамі. Да справы перакладаў падыход найчасьцей казённы. Пісьменьнікі, кваліфікаваныя работнікі—перакладчыкі «справамі дзіцячымі» не займаюцца, а калі і займаюцца, дык ня сур'ёзна. У выніку—пераклады большасьці кніжак неахайныя, «дубовыя».

Для прыкладу возьмем самыя, здавалася-б, лепшыя пераклады. Перад намі ўсім вядомая кніжка **Маякоўскага—«Што такое хорошо, что такое плохо».**

Кніжка Маякоўскага прызначана для малых дзяцей.

У перакладчыка назва кніжкі атрымалася такая: «Як узяць да ладу, што такое дрэнна, што такое блага». Ну, няхай сабе, ня будзем зважаць на гэты першы «пераклад».

У гэтай кніжцы мы маем многа такіх мясьцін:

«Калі стаў
благі хлапчук
Біць слабога.
нішкам...»
«Як ты
кніжку пашматаў
І апуку топчаш...»

Тут без акадэмічнага слоўніка не абыдзешся. А гэта-ж для маленькіх дзяцей!

А вось некаторыя «мастацкія рыфмы»: **абляжа-блага; пачвараю-тварыкаў; топчаш-хлопчык; птушку-нязрушным** і інш. Ёсьць парушэньні, і рытму зусім непатрэбныя для гэтага вершу. Напрыклад: **той-чысьціць валёнкі днём, мые сам галёшы,**—замест агульнага харэічнага рытму—**той валёнкі чысьціць днём...**

Адным словам, перакладчык добрую кніжку сапсаваў: яе чытаць і раіць дзецям нельга.

А вось кніжка для большых дзяцей: **Ф. Гра—«Марсэльцы».**

Пераклад зроблены неахайна. Тав Зарэцкі, як стыльрэдактар гэтай кніжкі, зусім мала аддаў увагі якасьці перакладу. Ад гэтага мастацкасьць кніжкі значна страціла. Кніжка перасыпана няўдалымі выразамі, незразумелымі для шырокіх мас дзяцей тэрмінамі—наватворамі, провінцыялізмамі, як: **дзевяцьдзесят, лунаць, крысы яго даўгія, набгом, угледзець,** погляд і інш.

Фразэолёгія ў шмат якіх мясьцінах проста недарэчная, напрыклад:

«Я скочыў у канаву, каб падняць яго (качан капусты—А. Я.), **але** ў той-жа момант да гэтага качана кінулася з другога боку сытая вялізная сьвіньня, **але** мне перашкодзіў пастух. Ён пераняў мне дарогу і сьцяў мяне палкай...» (стар. 13).

Такі выгляд «лепшых» перакладаў. Калі дадаць да сказанага памылкі чыста карэктурнага парадку, а іх у апошні час чамусьці разьвялося вельмі многа,—дык малюнак атрымаем сумны.

4. Мы дрэнна афармляем кніжкі

Вялікае месца ў дзіцячай літаратуры займае афармленьне кніжкі.

Тав. Стэцкі ў сваім лісьце ў выдавецтва «Молодая Гвардия» так ахарактарызаваў становішча з афармленьнем дзіцячай кніжкі:

«Книга, которая должна приобщить детей к процессам великой стройки и борьбы, происходящим вокруг, зажечь их энтузиазмам и воле з победе, выходит в свет на плохой бумаге, неряшливо отпечатанной, неопрятной, с рисунками, представляющими собой зачастую злую карикатуру на социалистическую стройку и ее героев».

І далей:

«Детская книга стала убежищем «левым» художников, демонстрирующих на ее страницах только свое сомнительного качества мастерство, свои искания, решительно не заботясь о том, как будут восприняты детской аудиторией их рисунки».

Гэтая характарыстыка цалкам адносіцца і да кніжак, што выдаюцца ў нас. Якасьць дзіцячай кнігі па лініі афармленьня вельмі нізкая. Прыкладам тут можа быць любая кніжка.

Агляд дзіцячай літаратуры павінен прайсьці пад знакам узмацненьня ўвагі і пільнасьці да справы стварэньня патрэбнай нам высокаякаснай комуністычнай кніжкі для дзяцей.

Друкарня імя Сталіна, Менск

Упаўнаважаны Галоўліту № А—728